Свая кішэня

# «Што мы шукаем? Самыя нізкія цэны на рамонтныя паслугі!»

**ПРЫКЛАДНА пад такім умоўным дэвізам (хоць чаму ўмоўным — так прамым тэкстам у многіх выпадках і давялося адразу пытацца, каб скіраваць суразмоўцаў у патрэбнае рэчышча) карэспандэнт «Звязды» правёў маніторынг цэнаў на будаўнічыя і рамонтныя работы, а таксама іншыя, звязаныя з добраўпарадкаваннем жылля. Зразумела, таннае — не заўсёды якаснае (зрэшты, як і наадварот), таму больш правільным, напэўна, было б сказаць, што мэтай пошукаў былі зніжкі. У гэтую пару года на рынку такіх паслуг назіраецца пэўны спад актыўнасці, прынамсі, так было ў папярэднія гады, адпаведна, можна было разлічваць на эканомію ўласных сродкаў. Дастаткова прыгадаць нават пачатак гэтага года, калі пасля павелічэння курсу долара тыя, хто яшчэ не паспеў «увязнуць» у рамонце, часова адкладвалі свае планы, а прадстаўнікі «рамонтнага бізнэсу», у сваю чаргу, былі гатовыя пайсці на ўступкі, каб толькі не страціць патэнцыяльнага кліента. А як цяпер? Сітуацыю хоць і нельга параўноўваць дакладна, але літаральна апошнімі днямі курс долара таксама змяніўся...**

## Расцэнкі пакуль не змяніліся ні ў які бок

Апошняя акалічнасць, наколькі нам стала зразумела, пакуль увогуле не паспела адбіцца на рынку паслуг. Ды і калі гаварыць па шчырасці больш глабальна: не заўважылі мы і нейкага традыцыйнага спаду актыўнасці тут. Мо, таму, што жылля ўзводзіцца ўсё больш? Як бы там ні было, але нас за рукі ніхто «не хапаў», зніжкамі не заманьваў. Як патэнцыяльным кліентам нам прапаноўвалі вызначыцца з аб'ёмамі патрэбных работ і замаўляць брыгады патрэбных работнікаў па чарзе. Самі цэны на будаўнічыя матэрыялы і рамонтныя паслугі ў цэлым таксама засталіся прыкладна на ўзроўні пачатку года. Прынамсі пакуль. Як заўважыў адзін індывідуальны прадпрымальнік, дастаткова вялікая колькасць будматэрыялаў прывязаная да расійскага рубля, бо завозіцца з гэтай краіны. І што будзе, скажам, праз месяц — другі, пакуль ніхто не скажа.

Расцэнкі, натуральна, могуць крыху адрозніваццa ў залежнасці ад выканаўцы — таго ж індывідуальнага прадпрымальніка ці прыватнага ўнітарнага прадпрыемства. Але ў цэлым, паўторымся, яны падобныя. Напрыклад, змыць адзін квадратны метр пабелкі на столі ў фірме каштуе 2850 рублёў, «індывідуал» для зручнасці агучыў цэннік у адзін долар. Таму далей для прыкладу дадзім некаторыя расцэнкі менавіта ў рублях.

За зняцце старых шпалераў (у залежнасці ад іх віду і колькасці слаёў) з вас папросяць ад 2 тысяч рублёў за «квадрат», за тую ж плошчу фарбы — удвая больш. За адзін нанесены слой грунтоўкі на столь (за ўсё той жа квадратны метр) трэба будзе аддаць 1140 рублёў, за тынкоўку па маяках — амаль 24 тысячы, за афарбоўку яе двойчы водаэмульсёнкай — яшчэ амаль 8 тысяч. Хочаце ўладкаваць падвясную столь з сайдынгу або панэляў ПВХ? Калі ласка, прыкладна тыя ж 24 тысячы за квадратны метр.

Тынкоўка сцэнаў са шліфоўкай пад шпалеры — каля 9 тысяч рублёў за «квадрат», паклеіць іх жа шпалерамі (шклошпалерамі, вінілавымі, папяровымі гладкімі, рэльефнымі з падборам малюнка) — 7—10 тысяч рублёў.

Пакласці лінолеум або дывановае пакрыццё будзе каштаваць кліенту каля 14 тысяч за квадратны метр, за ўкладку паркета, яго шліфоўку, лакіроўку ў тры слаі (без кошту ўладкавання асновы, як і ўласна саміх матэрыялаў для гэтага) трэба будзе заплаціць прыкладна 45,5 тысячы рублёў за «квадрат». Абліцоўка сцэнаў керамічнай пліткай у залежнасці ад яе памераў (зноў жа без кошту іх падрыхтоўкі да ўкладкі) — 32—40 тысяч за квадратны метр. Пакласці плітку на падлогу (без уставак) — таксама ад 32 тысяч рублёў. І гэтак далей.

А што са зніжкамі? Індывідуальны прадпрымальнік працуе сам на сябе, таму тут асабліва разлічваць на нешта не даводзіцца. Хіба на бясплатную дастаўку будматэрыялаў кліенту. У фірмы, асабліва калі замаўляць комплексны рамонт і на адносна вялікай плошчы, можна паспрабаваць атрымаць некалькі большыя зніжкі менавіта за кошт аб'ёмаў. Хоць існуюць і іншыя варыянты, напрыклад, можна зэканоміць пэўную суму, калі замовіць матэрыялы ў гэтай жа фірме, што будзе праводзіць рамонтныя работы, або ў таго прадаўца, з якім мае партнёрскія стасункі той жа прадпрымальнік.

Дарэчы, варта, на наш погляд, адзначыць яшчэ адзін нюанс. Усе прадстаўнікі «рамонтнага бізнэсу», з кім давялося весці перамовы, у адзін голас падкрэслівалі: усё — па афіцыйным дагаворы. Раней у падобных выпадках гучала прыкладна наступнае, маўляў, калі афіцыйна — адны расцэнкі на паслугі, калі без «пратакола» — іншыя, некалькі меншыя. Гэтую акалічнасць можна тлумачыць як працай падатковых органаў, так, падаецца, і канкурэнтнай барацьбой, калі, каб «трымацца на паверхні», трэба весці сябе адкрыта. А канкурэнцыя — заўсёды на карысць спажыўца, так бы мовіць, ускосная зніжка. Плюс гарантыя для самога спажыўца.

## Што з каляднымі зніжкамі?

Як мы ўжо неаднойчы паведамлялі, пакрысе ў краіне «набірае абароты» перадсвяточны гандаль з такімі прыемнымі спажыўцу зніжкамі і распродажамі, акцыямі і падарункамі. А што ў нашай сферы, няўжо чалавеку, які цяпер вядзе рамонт у кватэры або займаецца яе добраўпарадкаваннем, няма на што разлічваць?! Рэкламныя абвесткі сведчаць, што такі шанц ёсць. Праўда, пакуль пляскаць у ладкі не будзем.

Па шчырасці, рэкламы менавіта з каляднымі, навагоднімі зніжкамі няшмат, яна толькі з тыдзень, як пачала з'яўляцца. А вось «проста» сезонныя зніжэнні цэнаў прысутнічалі, да таго ж, ёсць яны і цяпер. І калі параўнаць перадсвяточныя і звычайныя прапановы, высвятляецца, што, па сутнасці, гаворка ідзе пра адны і тыя ж зніжкі і акцыі.

Ну вось мяркуйце самі. Вытворцы вокнаў з ПВХ запрашаюць звяртацца да іх, бо цяпер менавіта ў іх дзейнічаюць навагоднія зніжкі ў памеры 10—15 працэнтаў. Але суседнія абвесткі абяцаюць дакладна такія ж уступкі па цане, не называючы іх перадсвяточнымі. Ці нехта абяцае ў падарунак да Новага года, у выпадку замовы вокнаў, бясплатную маскітную сетку (пагадзіцеся, толькі ў гэты час яе і ўсталёўваць) або тэрмометр. Але многія робяць такія прэзенты кліенту і ў іншы час года, што ўжо казаць пра пару, калі назіраецца традыцыйнае зніжэнне колькасці замоў названых вырабаў.

Прыкладна тое ж і з замовамі на шафы-купэ. І «святочныя», і звычайныя зніжкі тут таксама аднолькавыя — ад 10 да 15 працэнтаў. Можна знайсці і фірму, што праводзіць акцыю — падарыць люстэрка бясплатна. Са зніжкамі прапануюць і ўладкаванне нацяжных столяў.

Больш праўдападобна выглядаюць абвесткі з канкрэтнымі тэрмінамі перадсвяточнага гандлю па меншых цэнах. Напрыклад, набыць артапедычныя матрацы ў перыяд да 31 студзеня з 10-працэнтнай зніжкай. Або да 31 снежня набыць любое крэсла (з цэлай лінейкі) за 82 тысячы рублёў. Салон кухняў таксама праводзіць навагоднюю акцыю: канкрэтны кухонны гарнітур даўжынёй два метры тут прапануюць за 700 тысяч рублёў. У звычайны час камплект каштаваў бы пакупніку каля 1 мільёна. «Дзе вы бачылі яшчэ такую перадсвяточную цану? — спыталі ў мяне прадаўцы. — Тым больш, што ў найбліжэйшы час гэты гарнітур будзе прапанаваны спажыўцам у трох розных каляровых выкананнях».

Зацікавіла і акцыя салона па продажы імпартных халадзільнікаў. Зніжкі абяцаныя былі аж да 50 працэнтаў. «Пазбаўляецеся ад састарэлых мадэляў?» — недаверліва пытаюся ў прадаўцоў-кансультантаў. «Ды што вы, абсалютна новая калекцыя. Проста немцы пачалі эканоміць на ўпакоўцы, і замест выкарыстання пры транспарціроўцы пенапласту толькі абцягнулі іх плёнкай. Вось месцамі і ўтварыліся пацёртасці. На белых мадэлях яны ўвогуле ледзь прыкметныя. А калі каму халадзільнік у нішу трэба паставіць, дык гэтыя пацёртасці па баках увогуле ніхто не заўважыць. А эканомія грошай якая? Зніжкі — ад 200 да 800 тысяч рублёў у залежнасці ад мадэлі».

...А ўвогуле, калі разабрацца, якая розніца, як называецца зніжка — сезоннай ці перадсвяточнай, навагодняй. Галоўнае, каб яна была, праўда? Грошы ніколі лішнімі не бываюць, асабліва калі і набытак зрабілі добры, які хацелі, ды яшчэ нешта і засталося. А словы, яны што? Проста дадаюць крыху больш настрою, нагадваюць пра добрыя святы!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

29.12.2009 в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой».

Повестка дня:

1. О приобретении акций ОАО «Минскэнергострой» на баланс Общества.
2. Об утверждении Регламента работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.
3. О совершении сделок Общества.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.

Начало регистрации — 12.00.

УНП 100008291

**У суд Барысаўскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **КУЧУКА Пятра Уладзіміравіча**, 18 ліпеня 1953 года нараджэння, ураджэнца в. Чурылава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства: Барысаўскі раён, в. Светлая Рошча, 12—2. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Кучука П.У., паведаміць іх суду Барысаўскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

# ДАХОД. ПЛЮС «КРАЙНІ ВЫПАДАК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апроч таго, існуе варыянт аднаразовай сацыяльнай дапамогі. Права на яе ўзнікае ў сем'яў, якія апынуліся ў цяжкай сітуацыі і да таго ж маюць нізкі даход — менш за 120 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму (300 084 рублі) на сёння або менш за 150 працэнтаў БПМ (375 105 рублёў) з 1 студзеня на чалавека ў месяц. Непасрэдна памер аднаразовай дапамогі можа вагацца ад 50 да 500 працэнтаў БПМ. Пры гэтым такая дапамога прызначаецца адзін раз на працягу года.

***☎— Мой брат жыве адзін і атрымлівае вельмі нізкую пенсію — 179 тысяч. Ці можа ён разлічваць на адрасную дапамогу?***

**Марыя Афанасьеўна,** *Капыльскі раён*

— Можа. Бо брат вядзе хатнюю гаспадарку адзін, а яго пенсія не перавышае бюджэт пражытковага мінімуму. Словам, брат павінен звяртацца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і напісаць заяву.

***☎— Я жыву з сынам-інвалідам, пенсія якога складае ўсяго 204 тысячы рублёў. Звярталася па адрасную сацыяльную дапамогу, але мне адказалі, што права на яе няма — мая зарплата і пенсія сына разам перавышаюць неабходную «планку». У сувязі з гэтым пытанне: на якую падтрымку, і перш-наперш матэрыяльную, мы можам разлічваць?***

**Ірына Іванаўна,** *г. Мінск*

— Каб атрымаць псіхалагічную, юрыдычную дапамогу ці «гуманітарку», можна звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства. Складаней з дапамогай матэрыяльнай — тут сапраўды ўсё залежыць ад даходаў. Пры разліку сярэднедушавога даходу ўлічваюцца ўсе члены сям'і. Але ў выпадку, калі па адным адрасе пражываюць некалькі сем'яў ці грамадзян, якія маюць агульны асабісты рахунак, але не вядуць сумесную гаспадарку, бяруцца пад увагу даходы кожнай сям'і або грамадзяніна асобна.

Факт асобнага вядзення гаспадаркі ўстанаўліваецца камісіяй на падставе акта абследавання матэрыяльна-бытавога становішча, які складаецца калегіяльна (не менш чым 3 чалавекамі) спецыялістамі органа па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва з прыцягненнем прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання, грамадскіх аб'яднанняў.

***☎— Завуць мяне Вера Яфімаўна, а цікавіць такое пытанне: ці будуць з новага года мець права на бясплатнае пратэзаванне малочнай залозы інваліды III групы?***

— Сапраўды, з 1 студзеня ў Беларусі ўводзіцца новы від сацыяльнай падтрымкі — дапамога на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі. Такая дапамога будзе выдзяляцца незалежна ад узроўню даходаў. А ў ліку яе атрымальнікаў — дзве катэгорыі. Гэта інваліды III групы (за выключэннем выпадкаў, калі інваліднасць наступіла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў, з прычыны алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення або ў выніку наўмыснага пашкоджання ўласнага здароўя), а таксама дзеці ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў сродках рэабілітацыі па медыцынскіх паказаннях.

У прыватнасці, дзецям ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў сродках рэабілітацыі, стане прызначацца дапамога на аплату артэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў (апараты, тутары), артэзаў тулава (гарсэты, бандажы, спінагаловатрымальнікі, жорсткія паясы), вырабаў лячэбнага пратэзавання для дзяцей (абдукцыйныя трусікі, распоркі), артапедычнага абутку, слыхавых апаратаў, тэст-палосак для вызначэння цукру ў крыві.

А інвалідам III групы будзе прызначацца дапамога на аплату пратэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў (у камплекце з чахламі), артэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў (апараты, тутары), артэзаў тулава (гарсэты, бандажы, спінагаловатрымальнікі, жорсткія паясы), артапедычнага абутку, слыхавых апаратаў, пратэзаў вачэй, інсулінавых шпрыцаў або аднаразовых іголак для тэст-ручак, тэст-палосак для вызначэння цукру ў крыві.

Такім чынам, можна заўважыць: гаворка ідзе аб найбольш жыццёва неабходных сродках рэабілітацыі, і пратэзаў малочнай залозы сярод іх няма.

***☎— Патлумачце, на якія льготы ўсё ж змогуць разлічваць інваліды III групы з 1 студзеня? У прыватнасці, цікавяць і льготы на пашыў абутку і зубапратэзаванне.***

**Міхаіл Іванавіч Сакалоўскі,** *г. Мінск*

— Зноў-такі варта паўтарыцца: са студзеня наступнага года інвалідам III групы незалежна ад узроўню даходаў будзе прызначацца сацыяльная дапамога на аплату асобных відаў тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, і ў тым ліку — на выраб артапедычнага абутку. Аднак для аплаты зубапратэзавання гэта дапамога не прызначаецца.

***☎— Як вядома, з новага года для прызначэння аднаразовай адраснай сацыяльнай дапамогі неабходна, каб памер даходу на кожнага члена сям'і не перавышаў 1,5 бюджэту пражытковага мінімуму. Патлумачце, калі ласка, у гэтым выпадку ўлічваюцца «чыстыя» грошы або грошы «з падаткамі»? Па-другое: за які час вылічваюцца даходы для аднаразовай дапамогі? І па-трэцяе: якім, уласна кажучы, можа быць памер такой дапамогі?***

**Марыя Пятроўна Сяргеенка,** *г. Гомель*

— Пры прызначэнні адраснай дапамогі бяруцца пад увагу даходы, разлічаныя да ўтрымання з іх падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў, прычым цяпер сярэднедушавы даход вызначаецца за 3 папярэднія перад зваротам месяцы, а з 1 студзеня разлік стане рабіцца за 12 папярэдніх месяцаў.

Што да памеру аднаразовай адраснай дапамогі, то, у залежнасці ад канкрэтнай жыццёвай сітуацыі, ён можа вагацца ад 50 да 500 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму, або на сёння — ад 125 035 да 1 250 350 рублёў.

***☎— Чытала, што ў хуткім часе для прызначэння штомесячнай адраснай дапамогі будуць прымацца да ўвагі даходы за папярэдні год. Аднак, як падаецца, гэта няправільна. Скажам, у сельскай гаспадарцы заробкі летам нібыта добрыя, а вось узімку — амаль на ўзроўні «мінімалкі». Атрымліваецца, што зімой вяскоўцы застаюцца за «бортам»?***

**Антаніна Аляксандраўна,** *Слуцкі раён*

— Сапраўды, з 1 студзеня сярэднедушавы даход будзе вылічвацца за 12 месяцаў перад зваротам. І мы перакананыя: менавіта такі падыход больш правільны, ён дазваляе ацаніць патрэбу ў дапамозе больш аб'ектыўна, незалежна ад «скачкоў» зарплаты або іншых даходаў на працягу года. Прычым сцвярджаць, што пасля новаўвядзення з сістэмы адраснай падтрымкі «выпадуць» тыя ж вяскоўцы, нельга.

***☎— Турбуюць з Лунінецкага раёна, адкажыце, калі ласка: навошта кожны раз пры звароце па адрасную сацыяльную дапамогу трэба пісаць заяву і збіраць паперы аб даходах? Няўжо не бачна, хто мае патрэбу ў такой дапамозе?***

— І само права на адрасную дапамогу, і яе канкрэтны памер залежаць ад узроўню даходаў — словам, абысціся без дакументаў тут нельга. Аднак варта заўважыць, што прызначэнне адраснай сацыяльнай дапамогі робіцца паводле адміністрацыйнай працэдуры «адно акно». Прэтэндэнт на выплаты абавязаны паказаць толькі дакументы, якія знаходзяцца «на руках», а ў выпадку працы — яшчэ і звесткі аб даходах. Усе астатнія дакументы могуць сабраць спецыялісты ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

***☎— У нашай сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід, цяпер яму 5 гадоў, у 2006 годзе зрабілі аперацыю — паставілі імплантант. Цяпер я знаходжуся ў «дэкрэтным» па доглядзе другога дзіцяці, якому 1 год. Даходы сям'і — пенсія па інваліднасці дзіцяці, дзіцячая дапамога плюс зарплата мужа прыкладна ў 750—800 тысяч рублёў. Мы звярталіся па адрасную сацыяльную дапамогу, але атрымалі адмову — даходы аказаліся крыху большыя, чым трэба. Між тым, толькі на батарэйкі для слыхавога апарата дзіцяці-інваліда ідзе па 260 тысяч штомесяц. І, апроч таго, у сувязі з адсутнасцю спецыялістаў у раёне, мы вымушаныя вазіць дзіця за 70 кіламетраў у садок у Мінск. А гэта — зноў-такі выдаткі на бензін.***

***У сувязі з гэтым пытанні. Ці можам мы разлічваць на якуюнебудзь дапамогу прынамсі, на батарэйкі? Якімі льготамі можа карыстацца наша сям'я? І ці могуць нам, паколькі мы наведваем дзіцячы садок у Мінску, выдзеліць у сталіцы часовае сацыяльнае жыллё або інтэрнат? Бо зразумейце, што мы не хочам кідаць сваё дзіця.***

**Святлана Пятроўна,** *Валожынскі раён*

— Калі зыходзячы з узроўню даходаў атрымліваць штомесячную адрасную сацыяльную дапамогу нельга, магчыма, падыдзе варыянт дапамогі аднаразовай — тым больш, што з новага года ўмовай для яе прызначэння стане даход, меншы за 150 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму на кожнага члена сям'і. Плюс да таго, з улікам цяжкай сітуацыі, можна паспрабаваць звярнуцца па дадатковую падтрымку ў райвыканкам.

Што да сацыяльнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, то напрамкаў тут некалькі. Так, паводле заканадаўства кожнае дзіця-інвалід мае права на сацыяльную пенсію, памер якой залежыць ад ступені страты здароўя. Пры першай ступені страты здароўя — 60, другой — 65, трэцяй — 75, чацвёртай — 85 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Такая пенсія прызначаецца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароны па месцы жыхарства.

Апроч пенсій, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, выплачваюцца штомесячныя дзяржаўныя дапамогі — да дасягнення 18-гадовага ўзросту. Дапамога на дзіця-інваліда выплачваецца па месцы працы (або навучання) маці або па месцы працы (навучання) бацькі, калі маці не працуе. Дапамога на такое дзіця павялічваецца на 40 працэнтаў. Скажам, у лістападзе дапамога на дзіця-інваліда ва ўзросце да 3 гадоў складала 280 080, а ва ўзросце больш за 3 гады — 162 550 рублёў у месяц. Прычым дапамогі на дзяцей-інвалідаў ва ўзросце больш за 3 гады выплачваюцца незалежна ад сукупнага даходу сям'і.

Органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне выплачваецца таксама дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у памеры 65 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму — цяпер гэта 162 550 рублёў. Права на такую дапамогу маюць маці, бацька або іншая асоба, якая фактычна здзяйсняе догляд дзіцяці і пры гэтым не працуе і не атрымлівае пенсіі. Дарэчы, з 1 студзеня мінулага года права на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў распаўсюджваецца і на бацькоў, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў. З мэтай узмацнення сацыяльнай абароны такіх сем'яў мэтазгодна разглядзець пытанне аб прадастаўленні дадзенага права таксама тым бацькам, якім прызначана пенсія па інваліднасці.

Час догляду дзіцяці-інваліда залічваецца ў стаж для прызначэння працоўных пенсій. Пры гэтым маці маюць права выходзіць на пенсію па ўзросце пасля дасягнення 50 гадоў — калі маці выхоўвалі дзіця-інваліда на працягу не менш чым 8 гадоў да яго паўналецця і пры гэтым маюць стаж працы не менш чым 20 гадоў.

Маці, якія сумяшчаюць догляд дзіцяці-інваліда з працай, на падставе 265-га артыкула Працоўнага кодэкса даецца адзін свабодны ад працы дзень у тыдзень і адзін у месяц з аплатай у памеры сярэдняга заробку. У 2008 годзе магчымасць карыстацца свабодным ад працы днём у тыдзень таксама атрымаў і бацька. Плюс да таго працуючым бацькам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, вызначаныя льготы па падаходным падатку — штомесячны стандартны падатковы вылік у 140 тысяч рублёў на кожнае дзіця.

Урэшце, можна нагадаць: дзеці-інваліды маюць права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне (пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў) або аздараўленне (пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў), на бясплатнае забеспячэнне лекамі і медыкаментознымі сродкамі на падставе рэцэптаў свайго ўрача; ільготы па праездзе, забеспячэнні тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі і г.д.

І наконт часовага жылля. На жаль, гэта пытанне знаходзіцца па-за кампетэнцыяй нашага міністэрства, таму ці не адзіны тут варыянт — зварот у Мінскі аблвыканкам, які ў сваю чаргу можа звярнуцца з хадайніцтвам да ўладаў сталіцы.

***☎— Мая пенсія складае каля 400 тысяч, але пры гэтым я жыву адзін і маю II групу інваліднасці. Ці магу я разлічваць на дапамогу ў рамонце дома? Бо самы танны куб лесу — гэта 70 тысяч рублёў...***

**Уладзімір Яфрэмавіч Скалубовіч,** *Крупскі раён*

— З гэтай праблемай, Уладзімір Яфрэмавіч, лепш за ўсё звярнуцца ў райвыканкам. У сваю чаргу тое ж паспрабуем зрабіць і мы.

***☎— Турбуюць з Гомельскай вобласці, а сітуацыя ўзнікла такая. У ліпені мая дачка нарадзіла мёртвае дзіця. Пры гэтым ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне адмовілі ў выплаце дапамогі за пастаноўку на ўлік да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці — маўляў, дзіця не было зарэгістраванае. І па-другое. Ці маем мы права на дапамогу на пахаванне дзіцяці? І якія тут трэба збіраць дакументы?***

— Артыкул 11 Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» вызначае, што права на дапамогу жанчынам, што сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, з'яўляецца ў выпадку своечасовай пастаноўкі на ўлік, рэгулярнага наведвання дзяржаўных устаноў аховы здароўя і выканання прадпісанняў медыкаў на працягу ўсяго тэрміну цяжарнасці. Пры гэтым такая дапамога прызначаецца на падставе медыцынскага заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі. Пры наяўнасці заключэння УКК, якое сведчыць, што жанчына рэгулярна наведвала ўрачоў і выконвала іх прадпісанні на працягу ўсяго тэрміну цяжарнасці, адмова ў прызначэнні дапамогі на той падставе, што дзіця нарадзілася мёртвым, неабгрунтаваная — дапамогу павінны выплаціць незалежна ад рэгістрацыі дзіцяці.

І яшчэ. Паводле Закона «Аб пахаванні і пахавальнай справе» ў выпадку нараджэння мёртвага дзіцяці пасля заканчэння 196 дзён цяжарнасці дапамога на пахаванне выплачваецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. Больш падрабязную інфармацыю на гэты конт, і ў тым ліку аб неабходных дакументах, можна атрымаць у райвыканкаме па месцы жыхарства.

***☎— Майму бацьку 91 год, ён з'яўляецца інвалідам I групы і мае патрэбу ў пастаянным доглядзе. Пры гэтым абедзве дачкі — ужо на пенсіі. Атрымліваецца, што бацьку патрэбная сядзелка. Але плаціць за яе амаль па 5 тысяч рублёў мы не ў стане. Што рабіць?***

**Ларыса Іванаўна Ісаева,** *г. Мінск*

— Ва ўсіх раёнах нашай краіны працуюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, прычым у тым ліку сярод паслуг такіх цэнтраў — паслугі сядзелкі. Аднак сапраўды: сядзелкі працуюць на пазабюджэтнай аснове, таму іх дапамога абыходзіцца нятанна.

Разам з тым, цэнтры робяць і іншую паслугу — пагадзінны дзённы догляд старых і інвалідаў, якім такі догляд неабходны. І розніца з сядзелкай тут толькі адна: пагадзінны догляд здзяйсняецца нейкі кароткі перыяд — скажам, некалькі гадзін у тыдзень. Магчыма, варыянт пагадзіннага догляду падыдзе менавіта вам, тым больш, што каштуе такая паслуга менш.

***☎— Мяне завуць Васіль Фёдаравіч. Чуў, што ў некаторых рэгіёнах інвалідам робіцца выдача памперсаў для дарослых. Але цікава: каму і на якіх умовах?***

— Сапраўды, гэтым займаюцца некаторыя тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Але нейкага агульнага правіла тут няма. Памперсы адносяцца да гуманітарнай дапамогі, а пытанні яе размеркавання — гэта кампетэнцыя мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Інакш кажучы, умовы выдачы ў кожным раёне могуць быць рознымі, і цікавіцца імі лепш за ўсё ў тых жа тэрытарыяльных цэнтрах.

***☎— Мужу, інваліду I групы, выдалі каляску, якая не падыходзіць па памерах. Што рабіць у такім выпадку? І як можна атрымаць супрацьпролежневы ложак?***

**Жанна Іванаўна,** *Лагойскі раён*

— Магчыма, прычыну выдачы «не той» каляскі трэба шукаць у індывідуальнай праграме рэабілітацыі або заключэнні ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя. А, магчыма, прычына ў неабходнасці вырабу каляскі паводле індывідуальнага праекта. Але ў любым выпадку, каб вырашыць пытанне аб замене, перш-наперш трэба звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Што ж да спецыяльнага супрацьпролежневага матраца, то варта заўважыць: інваліды I групы маюць права на яго атрыманне на ўмовах 50-працэнтнай аплаты ад поўнага кошту. Прычым звяртацца па супрацьпролежневы матрац трэба таксама ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

***☎— Неаднаразова спрабавала высветліць, якімі цяпер ільготамі карыстаюцца інваліды I і II груп, але чула розныя адказы. Магчыма, вы дапаможаце разабрацца?***

**Станіслава Баляславаўна Навумовіч,** *Стаўбцоўскі раён*

— Паводле Закона «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», інвалідам I і II груп з прычыны агульнага захворвання (апроч выпадкаў, калі інваліднасць наступіла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў, з прычыны алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення або ў выніку наўмыснага пашкоджання ўласнага здароўя) вызначаныя наступныя льготы.

**Першае.** 90-працэнтная зніжка з кошту лекаў, што выдаюцца па рэцэптах медыкаў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў, а інвалідам I і II груп з хірургічнымі захворваннямі пры наяўнасці адпаведнага медыцынскага заключэння — і з кошту перавязачных матэрыялаў у парадку, які вызначае Савет Міністраў.

**Другое.** Права на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў, металаакрылатаў, металакампазітаў, металакерамікі і фарфору, а таксама нанясення абаронча-дэкаратыўнага пакрыцця з нітрыд-тытану) у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя па месцы жыхарства.

**Трэцяе.** Забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі паводле Дзяржаўнага рэестра ў парадку і на ўмовах, вызначаных Саветам Міністраў.

**Чацвёртае.** Для непрацуючых інвалідаў I і II груп вызначана права на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў або аздараўленне пры адсутнасці супрацьпаказанняў — не больш за адзін раз у два гады. Пры гэтым асоба, якая суправаджае інваліда I групы ў санаторна-курортныя або аздараўленчыя арганізацыі, таксама забяспечваецца бясплатнай пуцёўкай без лячэння — пры ўмове, што неабходнасць у падобным суправаджэнні пацвярджаецца заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі.

**Пятае.** Інваліды I і II груп могуць карыстацца бясплатным праездам на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту, апроч таксі, незалежна ад месца жыхарства, а інваліды I і II груп, якія жывуць у сельскай мясцовасці, — таксама на аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжнародных зносінаў у межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства. Зноў-такі апошняе датычыцца і асобаў, якія суправаджаюць інваліда I групы.

**Шостае.** У інвалідаў I і II груп застаецца права на бясплатны праезд на чыгуначным, водным і аўтамабільным транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў — за выключэннем таксі. Прычым асоба, якая суправаджае інваліда I групы па накіраванні дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя да месца аказання медыцынскай дапамогі і назад, тут таксама карыстаецца бясплатным праездам.

**Сёмае.** Інваліды I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, што абавязаныя ўтрымліваць іх у адпаведнасці з законам, і жывуць адны або толькі з інвалідамі I і II груп або непрацуючымі пенсіянерамі на агульнай падставе, маюць права на 50-працэнтную зніжку з аплаты за тэхнічнае абслугоўванне і карыстанне жылым памяшканнем (з разліку на 20 квадратных метраў агульнай плошчы), права на 50-працэнтную зніжку з аплаты камунальных паслуг (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электра- і цеплаэнергія, вываз смецця, карыстанне ліфтамі) паводле вызначаных тарыфаў і ў межах нормаў спажывання, а інваліды I і II груп, якія жывуць у дамах без цэнтральнага ацяплення, — зніжку на паліва, якое набываецца зноў-такі ў межах вызначаных нормаў.

Апроч ільгот, вызначаных узгаданым законам, інвалідам групы прадугледжаныя і іншыя дадатковыя гарантыі — у галіне пенсійнага забеспячэння, адукацыі, працоўных адносінаў, выплаты падаткаў і пошлін.

***☎— Працаздольныя інваліды III групы ў дадатак да зарплаты атрымліваюць някепскую прыбаўку ў выглядзе пенсіі. Мы ж, пажылыя інваліды III групы, ніякай надбаўкі не маем. Хіба гэта правільна?***

**Уладзімір Іванавіч Навіцкі,** *Бераставіцкі раён*

— Калі чалавек захварэў і стаў інвалідам III групы ў 30 ці 40 гадоў, ён мае права на пенсію — мяркуем, тут вы згодныя. І калі такі інвалід не здаўся і знайшоў у сябе сілы працаваць — гэта можна толькі віталь. Прычым сам па сабе факт работы не з'яўляецца падставай для пазбаўлення права на пенсію па інваліднасці. Тым больш, што такі чалавек мае абмежаваную працаздольнасць.

***☎— Маё пытанне датычыцца пенсійнага заканадаўства. Ці плануецца ў найбліжэйшыя два гады ўносіць якія-небудзь змены ў парадак прызначэння настаўнікам пенсій па выслузе гадоў? Я нават чула, што гэта права ўжо адмененае. Наколькі адпавядаюць рэчаіснасці такія размовы?***

**Валянціна Чаропка**

— Магчымасць выхаду на пенсію раней за агульнавызначаны ўзрост (у 50 гадоў жанчынамі ці ў 55 гадоў мужчынамі) у асобных катэгорый педагагічных работнікаў застанецца. Адно, што калі цяпер датэрміновая пенсія гэтым катэгорыям прызначаецца на падставе Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», то ў перспектыве тут будзе дзейнічаць Закон «Аб прафесійным пенсійным страхаванні».

***☎— Атрымалася так, што я згубіла пасведчанне аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні. Ці можна неяк аднавіць картку?***

**Алена Мікалаеўна Путраш,** *г. Мінск*

— Калі вы працуеце або спрабуеце працаўладкавацца, то для аднаўлення пасведчання сацыяльнага страхавання неабходна звярнуцца з пісьмовай заявай да працадаўцы. А калі не працуеце, то па атрыманне пасведчання можна звярнуцца ў орган Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы жыхарства.

***☎— Ці ўлічваецца ў прафесійным стажы, які ўплывае на прызначэнне датэрміновых пенсій, час знаходжання на «бальнічных»?***

**Андрэй Васільевіч Нагараднюк,** *г. Мінск*

— У прафесійны стаж уключаюцца перыяды непасрэднай занятасці ў асаблівых умовах на працягу поўнага працоўнага дня і паводле працоўнага дагавора (калі за гэтыя перыяды працадаўца плаціць узносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне), а таксама перыяды працоўнага водпуску. У той жа час перыяды хваробы і часовай непрацаздольнасці ў прафесійны стаж не ўваходзяць.

***☎— Ці будзе павялічвацца ў Беларусі пенсійны ўзрост? І калі будзе, то ў якім годзе?***

**Іван Пятровіч Сяргеенка,** *Карэліцкі раён*

— Можна адказаць коратка: у найбліжэйшы час павышэння пенсійнага ўзросту не плануецца.

***☎— Неаднаразова даводзілася чуць, што ў хуткім часе працуючыя пенсіянеры змогуць атрымліваць толькі палову сваёй пенсіі. Ці так гэта?***

**Аляксей Ільіч Раздонаў,** *г. Гродна* **(і іншыя чытачы)**

— На сёння наконт працуючых пенсіянераў існуе толькі адно абмежаванне — у перыяд працы або прадпрымальніцкай дзейнасці не робіцца выплата пенсіі, разлічанай зыходзячы з індывідуальнага каэфіцыента больш за 1,3. І да таго ж гэта абмежаванне не закранае пенсіянераў, занятых у непасрэднай вытворчасці сельгаспрадукцыі на прадпрыемствах сельскай гаспадаркі. Такі ж падыход застанецца і ў найбліжэйшы час.

***☎— Калі пры выплаце пенсій працуючых пенсіянераў будзе ўлічвацца сукупны даход? Як падаецца, такі варыянт — самы правільны. Бо вось мой прыклад. Я пенсіянерка, працую вартаўніком у школе. Аклад — 195 тысяч. Але з-за таго, што мой індывідуальны каэфіцыент складае 1,98, з пенсіі вылічваюць каля 70 тысяч. Магчыма, калі б зарплата была б два мільёны, гэта і не было б адчувальна. А так узнікае пытанне: навошта працаваць?***

**Галіна Васільеўна,** *г. Мінск*

— Вы кажаце цалкам слушна — мы таксама за тое, каб пры выплаце пенсій улічваўся сукупны даход. Але змяненне заканадаўства ў гэтым плане — задача на перспектыву. Прычым нельга сцвярджаць, што яна будзе вырашана ўжо заўтра. З улікам нашых рэалій і вялікай, больш чым 560 тысяч, колькасці працуючых пенсіянераў тут ёсць шмат нюансаў. І выбраць тую ж мяжу сукупнага даходу — справа няпростая.

***☎— Здаецца, што ў параўнанні з расіянамі нашы пенсіі становяцца зусім мізэрнымі. Чаму так адбываецца?***

**Анатоль Міхайлавіч,** *г. Мінск*

— Пачнём з таго, што пенсіі ў Беларусі і Расіі — прыкладна роўныя. І тое, што сёння суседняя краіна заяўляе аб значным і неаднаразовым павышэнні выплат пенсіянерам, тлумачыцца толькі адным — там суадносіны пенсіі і зарплаты не вытрымлівалі ніякай крытыкі. Паводле рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы, гэтыя суадносіны павінны складаць, прынамсі, 30—40 працэнтаў. Аднак да апошняга часу ў Расійскай Федэрацыі гэты паказчык быў усяго 26 працэнтаў. Таму сапраўды, сёлета расіяне павышалі працоўныя пенсіі 4 разы, тады як мы — аднойчы.

Можна пагадзіцца, што назваць пенсіі ў нашай краіне высокімі нельга, сёлета нават адбылося невялікае зніжэнне іх рэальнага, з улікам змянення цэнаў, памеру. Аднак пенсіі будуць павялічвацца. І пры наяўнасці магчымасцяў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва (а пакуль асаблівай трывогі наконт паступленняў у яго сродкаў няма) мы будзем уносіць адпаведныя прапановы.

***☎— Завуць мяне Ігар Уладзіміравіч, тэлефаную ад імя сваёй бабулі Зінаіды Уладзіміраўны Сліж, якая жыве ў Мастоўскім раёне. Справа ў тым, што пенсія бабулі складае ўсяго 250 тысяч, нягледзячы на тое, што яна адпрацавала ў калгасе 40 гадоў да і яшчэ некалькі гадоў — пасля выхаду на пенсію. Кажуць, што прычынай нізкіх выплат з'яўляецца малы індывідуальны каэфіцыент — усяго 0,34. І ўсё ж, ці можна тут нешта зрабіць?***

— Каэфіцыент — гэта паказчык заробку. А ранейшыя памеры заробкаў у калгасах, на жаль, вядомыя. І адно, што мы можам зрабіць у гэтым выпадку, гэта праверыць, ці былі выбраны для разліку каэфіцыенту аптымальны перыяд.

***☎— Ці залічваецца ў стаж работа ў калгасе падчас навучання ў школе? І як залічваецца ў стаж тэрміновая служба ў войску падчас вядомых падзей у Нагорным Карабаху?***

**Анатоль Сяргеевіч Рымараў,** *г. Мінск*

— Пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў перыяд работы школьнікаў у калгасе ў стаж залічваецца. Аднак, паколькі тыя ж школьнікі членамі калгаса звычайна не былі, такі залік робіцца па фактычнай працягласці. І па другім пытанні. У стаж для прызначэння пенсій у нашай краіне будзе залічана толькі тэрміновая служба ў арміі Рэспублікі Беларусь або СССР.

***☎— Што рабіць, калі ў «патрэбным» для разліку пенсіі перыядзе ёсць перапынак у працы?***

**Міхаіл Аляксандравіч,** *г. Мінск*

— Сёлета пры прызначэнні пенсіі прымаюцца да ўвагі заробкі за любыя 15 гадоў запар з 25 апошніх гадоў працы. Прычым калі ў працы ёсць перапынкі, то ў перыяд вылічэння заробку яны проста не ўваходзяць.

***☎— У 2011 годзе споўніцца 50 гадоў, да гэтага часу адпрацавала 24 гады даяркай. Ці змагу я выйсці на датэрміновую пенсію?***

**Марыя Аляксандраўна,** *Барысаўскі раён*

— Паводле 12-га артыкула Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», жанчыны, якія адпрацавалі даяркамі не менш за 20 гадоў, могуць выходзіць на пенсію ў 50-гадовым узросце. Аднак трэба мець на ўвазе, што перыяды работы даяркай пасля 1991 года залічваюцца ў стаж пры ўмове выканання вызначаных нормаў абслугоўвання.

***☎— Як настаўнік, выйшаў на пенсію па выслузе гадоў. Аднак патэлефанавалі з былой школы і папрасілі, каб я часова вярнуўся і ў 3-4 чвэрцях «замяніў» сваю калегу, якая выходзіць у «дэкрэтны». Ці не страчу я пенсію?***

**Уладзімір Іванавіч,** *Лідскі раён*

— Калі чалавек афармляецца на працу на пасаду, якая дала права на пенсію па выслузе гадоў, то выплата такой пенсіі сапраўды прыпыняецца. І аднаўляецца толькі пасля таго, калі чалавек пакіне гэту працу.

Разам з тым, можна заўважыць: перыяд працы, на які прыпыніцца выплата пенсіі, у далейшым будзе залічаны ў стаж.

***☎— На пенсію выйшаў летась, а пэўны час дагэтуль быў зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага. Патлумачце, які перыяд знаходжання на ўліку ў службе занятасці залічваецца ў стаж?***

**Віталь Аляксеевіч Мігалевіч,** *Маларыцкі раён*

— З 1 жніўня 2006 года з перыяду атрымання беспрацоўным дапамогі ў службе занятасці ў стаж «ідзе» не больш чым 6 месяцаў.

***☎— У кастрычніку мінулага года памёр мой дзядуля — інвалід I групы і ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ці можа цяпер мая бабуля перайсці на яго пенсію? І ці мае права бабуля на якія-небудзь даплаты?***

**Таццяна Аляксандраўна Зайцава,** *г. Мінск*

— Перайсці на пенсію мужа ваша бабуля можа. Аднак варта заўважыць, што памер такой пенсіі складзе 40 працэнтаў не пенсіі карміцеля, а заробку карміцеля. Таму такі пераход выгадны не заўсёды. І каб высветліць, трэба гэта рабіць або не, неабходна звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне з просьбай пралічыць усе варыянты.

Што ж да даплат, то (калі дзядуля быў не інвалідам, а толькі ўдзельнікам вайны) яны не прадугледжваюцца заканадаўствам.

***☎— Здарылася так, што ў лістападзе раптоўна памерла мая жонка ва ўзросце 38 гадоў. У мяне засталіся двое няпоўнагадовых дзяцей. Ці могуць прызначыць ім пенсію па страце карміцеля? І калі так, то ў якім памеры?***

**Аляксандр Сцяпанавіч,** *Аршанскі раён*

— Пенсію прызначыць павінны. Для гэтага неабходна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне з заявай, пашпартам, пасведчаннямі аб нараджэнні дзяцей, пасведчаннем аб смерці, а таксама дакументамі аб стажы і заробках маці (працоўнай кніжкай і даведкамі аб заробках да 2003 года — звесткі пасля гэтай даты будуць запатрабаваныя ўпраўленнем у Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва). Прычым калі зварот адбудзецца на працягу года з дня смерці, то пенсію па страце карміцеля прызначаць з дня смерці жонкі на кожнае няпоўнагадовае дзіця.

Калі маці працавала, то памер пенсіі будзе залежаць ад яе ранейшага заробку, але ў любым выпадку гэты памер не павінен быць меншым за 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросце. Калі ж маці не працавала, то дзецям прызначаць сацыяльную пенсію па страце карміцеля — у памеры 65 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму.

Застаецца дадаць, што пенсія па страце карміцеля прызначаецца да 18-гадовага, а ў выпадку навучання на дзённай форме ва ўстановах адукацыі — да 23-гадовага ўзросту дзяцей.

***☎— Абставіны складваюцца так, што, каб даглядаць дзяцей, трэба пераходзіць на палову стаўкі. Як адаб'ецца гэты пераход на памеры пенсіі ў будучыні?***

**Маргарыта Васільеўна,** *г. Мінск*

— Калі на палову стаўкі вы будзеце атрымліваць больш чым мінімальную зарплату, то на стажы пераход ніяк не адаб'ецца. Іншая рэч, што на палову стаўкі вы будзеце зарабляць менш. А гэта можа не лепшым чынам паўплываць на індывідуальны каэфіцыент заробку.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**
**Фота аўтара.**

# У ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ

## Сацыялагічныя даследаванні дэманструюць, што Беларусь арганічна ўпісваецца ў сям'ю народаў на сваім кантыненце

**ЧЫМ дыхаюць беларусы і як да нас ставяцца суседзі па мацерыку? Нам застаецца толькі здагадвацца пра гэта — па нейкіх заявах замежных гасцей, па паведамленнях у прэсе. А ёсць жа правераная крыніца інфармацыі — апытанні грамадскай думкі. Наколькі мы гарманіруем з еўрапейцамі і як яны ўспрымаюць нас, чаму ў Беларусі немагчымыя «каляровыя» рэвалюцыі і канфлікты на нацыянальнай глебе, высвятляем разам з вядомым навукоўцам, дырэктарам Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, доктарам сацыялагічных навук, прафесарам Давідам РОТМАНАМ.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### Палітычныя каштоўнасці — другасныя

— Наш Цэнтр рэгулярна праводзіць даследаванні «Еўрапейскія каштоўнасці». Гэты праект здзяйсняецца ва ўсіх краінах Еўропы, і беларусы абсалютна блізкія да агульных каштоўнасцяў. Праведзенае намі даследаванне паказала, што наша краіна — цалкам еўрапейская. Гадоў 20 таму нашымі калегамі ў Беларусі праводзіліся даследаванні ў рамках праекта «Сусветныя каштоўнасці», тады прыкладна такія ж пытанні задаваліся. І мы зрабілі цікавыя параўнанні.

Аналітыкі Цэнтра супаставілі каштоўнасці моладзі тагачаснай і сённяшняй, параўналі, якія прыярытэты былі ў юнакоў тады і ў іх цяперашнім узросце, амаль на 20 гадоў пазней.

— Атрымалася вельмі цікава. Самае галоўнае, што каштоўнасці (маюцца на ўвазе базавыя: сям'я, праца, сябры, сацыяльны капітал, вольны час) — рэч вельмі ўстойлівая. У чым жа праявілася дынаміка з часоў Савецкага Саюза? Па-першае, у рэзкім змяненні рэлігійных каштоўнасцяў: калі тады зусім мала людзей казала, што рэлігія для іх каштоўнасць, то цяпер гэта лічба рэзка ўзрасла. У савецкія часы моцная антырэлігійная прапаганда была, з аднаго боку, а з іншага — тыя, хто ўсё ж верыў, асцерагаліся пра гэта гаварыць. Цяпер у гэтым плане поўная свабода, і для большасці людзей рэлігійныя каштоўнасці апынуліся ў прыярытэтах. Па-другое, — і гэта цалкам еўрапейская тэндэнцыя — уніз пайшлі палітычныя каштоўнасці. У савецкі час гэта ўсё штучна, пад націскам будавалася, а цяпер стала дастаткова свабодна. І ва ўсёй Еўропе палітычныя каштоўнасці для чалавека — не галоўнае. Так, актыўны ўдзел у выбарах — гэта вельмі важна і патрэбна, але палітычныя каштоўнасці вызначаюцца таксама ўдзелам у палітычных блоках, спрэчках, супрацьстаяннях — тут высокай актыўнасці не назіраецца. Змяняецца парадыгма каштоўнасцяў і з узростам: скажам, у моладзі на першым месцы — сябры, вольны час, а ў людзей больш сталага ўзросту — сям'я, праца.

### Нацыянальныя разлады нам не пагражаюць

Еўрапейскі кантэкст мае месца не толькі ў выніках даследаванняў, але і ў самім іх правядзенні. Так, Цэнтр удзельнічае ў дзвюх праграмах па лініі ЕС. Адна з іх па здароўі. Даследаванні праводзяцца на постсавецкай прасторы. У Беларусі апытанне запланаванае на красавік-май. Пункты адліку для даследавання — алкагалізм, тытунекурэнне, дыябет. Праграмы FP-7, прапанаваныя Еўрасаюзам, — вельмі цікавыя і карысныя, яны могуць быць выкарыстаныя для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў у разнастайных сферах жыцця.

— Мы вельмі даўно ўдзельнічаем у міжнародных праектах, у нас трывалыя сувязі з сацыялагічнымі службамі шмат якіх краін. І гэта вельмі важна — ад нейкай адной арганізацыі ніхто аніякіх заявак не прымае, рэалізоўваць такія праекты можна толькі ў кансорцыуме. Мы спрацаваліся з замежнымі калегамі, таму ў нас атрымліваецца ўдзельнічаць у конкурсах і выйграваць. Аднак, на жаль, іншыя сацыялагічныя структуры гэтых кантактаў не маюць, і, відаць, гэта не зусім нармальна, — лічыць Давід Ротман.

Другі праект з нашым удзелам (у рамках праграм FP-7 Еўрапейскага Саюза) — ідэнтычнасці нацыянальных меншасцяў. ENRI-East — гэта міжнародны навукова-даследчы праект, у якім бяруць удзел сацыёлагі з 10 краін Еўрапейскага саюза і СНД. Мэта такога даследавання — вывучэнне праблем мовы, культуры, традыцый, ладу і ўмоў жыцця прадстаўнікоў розных нацыянальных груп. Аналізуецца сітуацыя ў Беларусі, Венгрыі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Славакіі, ва Украіне і інш.

— Мы працуем у цеснай кааперацыі, па адным і тым жа інструментарыі, аб'яднаўшы нашы падыходы і выпрацаваўшы разам адзіны для ўсіх бланк інтэрв'ю. Пасля апытанняў усё будзе зводзіцца ў адзін масіў. Можна будзе параўнаць сітуацыю ў розных краінах. У Беларусі мы даследуем сітуацыю з палякамі, якія пражываюць на нашай тэрыторыі, пераважна гэта Гродзенская вобласць. Да канца снежня ў нас будзе ісці апытанне, у ім возьмуць удзел 800 прадстаўнікоў польскай дыяспары ў нашай краіне, мяркую, да наступнага лета ўсе звесткі злучым. Вывучэнне гістарычных, этнічных, культурных аспектаў — гэта шлях да захавання нацыянальных адметнасцяў. У нейкай ступені наша даследаванне мае на ўвазе і перспектыўныя палітычныя мэты — каб гэта інфармацыя трапляла ў органы ўлады той краіны, на тэрыторыі якой праводзіцца даследаванне, і яны больш усвядомлена працавалі з меншасцямі, спрыялі захаванню іх самабытнасці. Сёння гэта вельмі актуальна для Еўропы на фоне таго, што ў некаторых краінах на нацыянальнай глебе адбываюцца сур'ёзныя канфлікты. Паглядзіце на сітуацыю ў Іспаніі, на Балканах, а цяпер вось Абхазія і Паўднёвая Асецiя.

Сацыёлаг упэўнены, што нашай краіне такія канфлікты не пагражаюць — «беларусы заўжды славіліся сваёй талерантнасцю і памяркоўнасцю». Дарэчы, заказу на апытанне насельніцтва Беларусі па абхазска-асецінскім пытанні Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў пакуль не атрымліваў, «хоць пытанне такое і ставілася». І на думку Давіда Ротмана, узважаныя адказы на гэта няпростае пытанне могуць даваць толькі эксперты, а ніяк не насельніцтва.

— Мы павінны думаць перш за ўсё пра эканамічныя інтарэсы Беларусі — калі мы нешта пачнём страчваць ад гэтага прызнання, тады нельга прызнаваць, і наадварот, — мяркуе сацыёлаг. — А галоўны падыход — нейтральнасць, узважанасць, абачлівасць, няспешнасць. Так і робіцца.

### Віртуальныя дэбаты

Сярод даследаванняў палітычнай скіраванасці прыкметны «Новы еўрапейскі барометр», які праводзіцца з перыядычнасцю раз на тры гады: вывучаюцца праблемы, звязаныя з ладам жыцця, палітычнымі перавагамі. Або праграмы міжнароднай арганізацыі па вывучэнні электаральных сістэм.

— Гэта паслявыбарчыя даследаванні. Удзельнічаюць практычна ўсе краіны свету, і вельмі цікава параўноўваць вынікі па многіх дзяржавах. Летась мы праводзілі даследаванні па выніках парламенцкіх выбараў. Некаторыя назіральнікі робяць высновы аб недэмакратычнасці выбараў, але такія апытанні дазваляюць аднаўляць справядлівасць. Ацэнкі нашых выбаршчыкаў досыць пазітыўныя, і становіцца бачна, наколькі правільныя вынікі выбараў. Можа, некага гэта вельмі здзіўляе, але яны супадаюць, і гэта вельмі важна, — дзеліцца з намі кіраўнік Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ.

Рыхтуюцца даследчыкі і да прэзідэнцкай кампаніі.

— Цяпер якраз вызначаемся, якім чынам будзем весці даследаванні на працягу наступнага года. Інтэнсіўныя электаральныя даследаванні пачынаюцца з аб'яўлення даты выбараў. Апроч пастаянных замераў на розных этапах выбарчай кампаніі, праводзіцца кантэнт-аналіз прэсы.

Самы цікавы аб'ект для аналізу — выступленні палітыкаў. І беларускія сацыёлагі тут досыць вынаходлівыя. Паколькі публічныя дэбаты ў Беларусі не практыкуюцца, іх у навуковых мэтах мадэлююць...

— Мы распрацавалі такі метад — нашым замежным калегам ён вельмі падабаецца, — віртуальная фокус-група, або апытанне недаступных рэспандэнтаў. Пагадзіцеся, самыя высокія службовыя асобы далёка не заўсёды даступныя для сацыёлагаў. Дык вось, калі мы бяром выступленні вядучых палітыкаў па адной тэме, мы можам супаставіць меркаванні ўсіх кандыдатаў. Па сутнасці, змадэляваць паміж імі спрэчку. Супастаўляючы выступленні розных палітыкаў, мы проста апісваем электаральную сітуацыю і не выстаўляем гэта на шырокі агляд, так што аніякай прапаганды ў гэтым няма. Затое гэты матэрыял, поруч з апытаннямі выбаршчыкаў, дазваляе рабіць прагнозы пра тое, хто стане пераможцам на выбарах.

Сацыёлагі павінны захоўваць бесстароннасць. Гэта карысна ў першую чаргу для саміх палітыкаў, мы ў свой час аналізавалі выступленні Гарбачова па яго просьбе. Калі яму паказалі вынікі, ён схапіўся за галаву: выступленні аб шляхах развіцця эканомікі на працягу літаральна паўгода былі ледзь не палярнымі...

### Беларусам крызіс не заўважны

Паводле апошняга сацыяльна-палітычнага апытання, праведзенага ў лістападзе, колькасць занепакоеных крызісам беларусаў знізілася (у параўнанні з красавіком).

— Тэма крызісу працягвае мусіравацца, аднак людзі паступова супакойваюцца. Відаць, упэўніліся, што нічога страшнага не здараецца — гэтак жа, як і з нашумелым грыпам: спачатку была паніка, а цяпер вось усё ціха. Не скажу, што рэзка знізілася колькасць занепакоеных крызісам: два-тры працэнты — гэта зусім мала, у межах памылкі верагоднасці, але ва ўсякім выпадку не павялічылася колькасць людзей, якія адчуваюць трывогу. Іх увогуле не вельмі шмат, менш за 50 працэнтаў.

На думку суразмоўцы, на выбарах гэта ніяк не адаб'ецца.

— Паўплывала б толькі ў тым выпадку, калі б уладзе не ўдалося ўтрымаць раўнавагу ў эканоміцы. А ў нас усё было падкантрольна кіраўніцтву краіны. Не было дапушчана масавага беспрацоўя, шматдзённых прастояў на прадпрыемствах. Магчыма, заробкі знізіліся, а цэны на прадукты павысіліся, і ў выніку рэальныя даходы сталі меншымі, але відавочна, што гэта было не настолькі заўважна для людзей, каб выклікаць адкрытую і актыўную негатыўную рэакцыю.

А менавіта паказчык задаволенасці народа, на думку навукоўца, вызначае шмат якія палітычныя працэсы.

— Мы шмат гадоў запар праводзілі міжнародныя даследаванні па ладзе жыцця. Па здаволенасці людзей сваім становішчам Беларусь сярод краін СНД заўжды знаходзілася на самых высокіх пазіцыях. Мы з калегамі неяк выпадкова заўважылі, што краіны, у якіх адбыліся «каляровыя» рэвалюцыі, заўжды былі на апошніх месцах у гэтым рэйтынгу. Упэўнены, што ў нас такое немагчыма, таму што людзі дастаткова высока ацэньваюць свой узровень жыцця. Няхай гэта не самае добрае і забяспечанае жыццё, але ж людзі задаволеныя. Асабліва калі яно хоць крыху паляпшаецца. Рэзкіх перападаў у нас няма, сітуацыя вельмі стабільная, гэта пацвярджаюць і даследаванні нашых калег.

Дарэчы, нядаўнія папраўкі ў выбарчае заканадаўства эксперт лічыць эвалюцыйнымі і заканамернымі — «наша краіна ідзе сваім шляхам». Нейкіх рэвалюцыйных зменаў ва ўспрыняцці нашай краіны захадам ад іх не чакае, бо...

— Успрыняцце Беларусі ўжо змянілася. Мне ўвесь час даводзіцца кантактаваць з калегамі з розных краін свету. І вось нядаўна такая гутарка была: калі б Беларусь захацела, яе ў першую чаргу прынялі б у ЕС! Не Украіну, не Грузію, а менавіта Беларусь. Такія размовы я чуў сярод калег з Вялікабрытаніі, Германіі, Аўстрыі, Украіны, Расіі. Не таму што ў вас выбітныя поспехі ў дэмакратызацыі ці ў эканоміцы, а таму што краіна стабільная, — кажуць яны. Усе пераўтварэнні і далей могуць адбывацца, а краіна стабільная і не выкліча нейкіх зменаў у самім Еўрасаюзе. Так што там мы ўспрымаліся б гарманічна.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

# НЕ ХАПІЛА МЕСЦА



(8 017) 287 19 68

***Я апынулася ў складанай сітуацыі і хацела б даведацца, ці правільна са мною паступілі, а калі не, то што мне рабіць. У 2007 годзе я скончыла педвучылішча і была накіравана на працу настаўніцай у адну са школ раёна на падмену дэкрэтнага водпуску настаўніцы, што працавала да мяне. Так было напісана ў загадзе. У студзені гэтага года я сама пайшла ў дэкрэтны водпуск, а мае гадзіны аддалі дзвюм іншым настаўніцам. У верасні настаўніца, якую я падмяняла, не выходзячы на працу, пайшла ў другі дэкрэтны водпуск. З гэтай даты на яе месца, ужо замест мяне, загадам прызначылі адну з настаўніц. Я стала лішняй. Завуч патлумачыла, што мне проста не хапіла месца. Загада аб маім звальненні пакуль няма, бо я выхоўваю малое дзіця, але і настаўніцай гэтай школы я не лічуся, маё прозвішча проста пішуць для атрымання дзіцячай дапамогі.***

**Я.В.**

Звычайна пры прыёме на працу на час выканання абавязкаў работніцы, якая знаходзіцца ў сацыяльным водпуску па цяжарнасці і родах, або па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, з новым работнікам заключаецца тэрміновы працоўны дагавор.

У адпаведнасці з артыкулам 18 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, працоўны дагавор павінен заключацца ў пісьмовай форме ў двух экзэмплярах, якія падпісваюцца двума бакамі, адзін экзэмпляр застаецца ў наймальніка, а другі перадаецца работніку.

У тэрміновым працоўным дагаворы абавязкова павінен быць пазначаны яго тэрмін. Аднак у падобных на ваш выпадках канкрэтная дата заканчэння тэрміну дагавора не пазначаецца, паколькі ў асноўнай работніцы, на месца якой вас прынялі, ёсць права ў любы момант перарваць сацыяльны водпуск і выйсці на працу. У дагаворы пазначаецца, што работнік прыняты на час знаходжання асноўнага работніка ў сацыяльным водпуску і назначаецца ад гэтага водпуску. Зазірніце ў свой дагавор.

Артыкул 38 Працоўнага кодэкса вызначае, што працоўны дагавор, заключаны на час выканання абавязкаў работніка, які часова адсутнічае, спыняецца з дня, што папярэднічае дню выхаду гэтага работніка на працу.

Мяркую, што вас пакуль не звольнілі, а інакш абавязаны былі ў дзень звальнення разлічыць і выдаць працоўную кніжку. Акрамя таго, дзіцячыя дапамогі выплачваюцца менавіта па месцы працы маці, як вызначана Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Калі маці не працуе і не вучыцца, дапамогі выплачваюцца па месцы працы бацькі, а пры яго адсутнасці непрацуючым маці дапамогі прызначаюцца камісіямі, што ствараюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і выплачваюцца органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

Гарантыі, прадугледжаныя артыкулам 268 Працоўнага кодэкса, якія датычацца забароны скасавання працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з жанчынамі, у якіх ёсць дзеці, не распаўсюджваюцца на вас і на настаўніцу, якая цяпер працуе замест вас, па той прычыне, што скасаванне тэрміновага працоўнага дагавора не з'яўляецца скасаваннем па ініцыятыве наймальніка.

Ваш дагавор мае тэрмін, які абумоўлены датай выхаду на працу асноўнага работніка. Настаўніца, на час адсутнасці якой вас прынялі, мае права ў любы момант выйсці на працу, не абавязкова пры гэтым чакаць спаўнення дзіцяці трох гадоў. У гэтым выпадку наймальнік будзе абавязаны звольніць як вас, так і настаўніцу, якая пераведзена на гэту пасаду на час вашай адсутнасці.

Знаходжанне работніцы ў водпуску па доглядзе дзіцяці не з'яўляецца перашкодай для спынення працоўнага дагавора ў такіх выпадках. Звальненне робіцца па п. 2 арт. 35 Працоўнага кодэкса ў сувязі з заканчэннем тэрміну працоўнага дагавора.

Замест звальнення адміністрацыя (пры наяўнасці магчымасці) можа прапанаваць вам і настаўніцы, якая працуе замест вас, перавод на вакантныя месцы. Аднак гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі такія месцы будуць у наяўнасці.

Адміністрацыя, мяркую, заканадаўства не парушыла. Аднак з упэўненасцю сцвярджаць, так гэта ці не, можна толькі пасля азнаямлення з дакументамі: загадамі, працоўнымі дагаворамі.

Пры наяўнасці сумненняў вы можаце звярнуцца па дапамогу ў пракуратуру. Згодна з артыкулам 14 Закона «Аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь», пры наяўнасці парушэнняў правоў і законных інтарэсаў грамадзян пракуратура прымае меры па іх узнаўленні і прыцягненні парушальнікаў да вызначанай заканадаўствам адказнасці. Для высвятлення ўсіх акалічнасцяў пракурор, у адпаведнасці з артыкулам 27 гэтага Закона, мае права патрабаваць ад кіраўнікоў арганізацый падачы ўсіх неабходных дакументаў.

# АД УСХОДУ ДА ЗАХАДУ ДРАПЕЖНАЯ ФАЎНА

КХЛ

**ПЕРАД чарговым перапынкам у рэгулярным чэмпіянаце КХЛ мінскае «Дынама» правяло дзве гульні. У пятніцу ў госці да нашай каманды завіталі казанскія «барсы», а ў нядзелю ўжо мінчане выправіліся ў падарожжа ў логава рыжскіх «ільвоў».**

Казанская каманда цяпер займае толькі шостае месца ва Усходняй канферэнцыі. Але «Ак Барс» — гэта надзейна замацаваны на постсавецкіх прасторах брэнд. Клуб са сталіцы Татарстана мае ў сваім складзе такіх майстроў найвышэйшага ўзроўню, як Марозаў, Зарыпаў, Нікулін, Цярэшчанка. Усе яны рэгулярна выступаюць за зборную Расіі — наймацнейшую каманду свету двух апошніх гадоў. А калі яшчэ дадаць да гэтага зорнага спісу фінскую тройку Іманен-Капанен-Песанен, зусім не здзіўляе тое, што «бела-блакітным» на сваім лёдзе не хапіла класу. Як і месяц таму ў Казані, мінчане першымі адкрылі лік — фінтом абышоўшы суперніка і кінуўшы з-пад абаронцы, на восьмай хвіліне вызначыўся нестарэючы Алег Антоненка — але, як кажуць, супраць танка не папрэш. Узровень майстэрства «барсаў» выяўляўся ў самым маленькім і незаўважным. Адзін крок, адно імгненне, хтосьці недапрацаваў — і атрымайце шайбу ў свае вароты. Перад апошнім перапынкам лік на табло быў 1:3, але «бела-блакітныя», нечакана нават для сваіх заўзятараў, заварушыліся, пачалі трывожыць галкіпера гасцей. На жаль, большага, чым падраўняцца па колькасці кідкоў, не атрымалася. Іманен жа наогул зрабіў лік больш звычным для гэтага сезона: 4:1 на карысць суперніка.

Наступны паядынак супраць рыжскага «Дынама» быў асаблівым для падапечных Аляксандра Андрыеўскага. Акрамя традыцыйнай прынцыповасці дынамаўскіх дэрбі, гульня вызначалася яшчэ і непасрэднай барацьбой за больш высокае месца ў турнірнай табліцы: пасля папярэдняга тура супернікаў раздзялялі толькі тры балы.


Фота БЕЛТА.

Актыўна распачаўшы, «зубры» не змаглі ўсё ж «размачыць» Эдгара Масальскіса. Неблагія моманты мелі Антоненка і дэбютант каманды Сяргей Варламаў (украінец перабраўся ў стан «бела-блакітных» з кіеўскага «Сокала»), ад сіняй лініі кідаў Плат, але Масальскіс быў непрабівальны. Латвійцы ж выкарысталі амаль што адзіныя моманты, якія мелі за ўсю гульню. На рахунку капітана рыжан Аляксандра Ніжывія шайба і галявая перадача. «Сухая» статыстыка пасля гульні выдала лічбы 16:31. Гэта колькасць кідкоў за матч. Як бачым, у беларусаў двайная перавага ў гэтым кампаненце зусім не перарасла ў якасць. Цяпер застаецца толькі чакаць у госці з візітам у адказ гэтых самых рыжскіх «ільвоў». Чэмпіянат КХЛ узнаўляецца 22 снежня.

**Яўген ВАРАКСА.**

# ХАНУКАЛЬНЫЯ СВЕЧКІ


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Свята свечак — Ханука — праходзіць у іудзеяў, расказалі ў Мінскім яўрэйскім абшчынным доме. Яно працягнецца восем дзён, па 19 снежня. Адзначаецца яно ў памяць аб цудзе, які адбыўся пры асвячэнні Іерусалімскага храма ў 164 годзе да нашай эры — пасля перамогі войска Іегуды Макавея над арміяй цара Анціоха. Увайшоўшы ў храм, воіны Макавея знайшлі збанок алею, якога было дастаткова для падтрымання агню ў храмавай свяцільні на працягу толькі аднаго дня. Аднак агонь гарэў восем дзён — столькі, колькі спатрэбілася для прыгатавання новага алею...

**Таццяна БАЦЮК,** *«Мінск—Навіны».*

## КАСМІЧНЫЯ «ПРЫШЭЛЬЦЫ» НА МІНЕРАЛАГІЧНАЙ ВЫСТАВЕ

**Навагодняя мінералагічная выстава-кірмаш «Каменная казка» адкрыецца 16 снежня ў галоўным корпусе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.**

«Іскрынкай» навагодняй выставы павінны стаць экспазіцыі «Народжаныя ў космасе» і «Эвалюцыя хвойных». Да ўвагі наведвальнікаў будуць прапанаваны таксама калекцыі мінералаў, горных парод і палеанталагічныя экспанаты з Кольскага паўвострава, Урала, Сібіры, Афрыкі, Амерыкі і іншых рэгіёнаў свету. Знойдзецца месца на выставе і работам майстроў Беларускага саюза народнай творчасці, а таксама грамадскага аб'яднання супрацоўніцтва дзелавых і творчых жанчын. Завершыцца «Каменная казка» 19 снежня традыцыйным узнагароджаннем аўтара самага цікавага мінералагічнага экспаната і вызначэннем пераможцаў у намінацыях «арыгінальная работа майстра» і «эксклюзіўная выставачная калекцыя».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

**«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6**

Завяршаем гэты класіфікацыйны конкурс:



№ 15. **Белыя:** b2, c7, d6, e1, h4 (5). **Чорныя:** a3, a7, e5, f4, g7 (5). **Выйгрыш**.

Паспяхова выканаць заданне дапаможа наступны эцюд:

**Белыя:** g3, h4, дамка a3 (3). **Чорныя:** a7, e3, g7, h2 (4). Развяжыце яго ў рамках **бліца-52/4**.

Міні-праблема і эцюд вядучага рубрыкі па электроннай пошце праверана на супадзенні і дакладнасць рашэнняў нашым кансультантам Антанасам Гімбутасам (Літва).

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

**АЎТАРСКІ-9**

У мінулых выпусках мы аб'явілі яго з нормай першага спартыўнага разраду па міжнародных шашках і на прызы чэмпіёна свету па шашачнай кампазіцыі ў жанры камбінацыйных мініяцюр-100 Уладзіміра Матуса, якому належаць усе 15 заданняў. Сёння падаём трэцяе з іх.



**Белыя:** 7, 10, 13, 17, 18, 26, 46 (7). **Чорныя:** 27, 31, 33, 37, 40, 42, 43 (7). **Перавага белых.**

Уладзімір Матус — наш зямляк з Гродзенскай вобласці, зараз жыве ў Маскве, дзе працуе ў спецыялізаванай калегіі адвакатаў «Міжнародная юрыдычная кампанія». Адначасова ён прапанаваў правесці не толькі конкурс рашэнняў кампазіцый, але і іх складання ў жанры 100-клетачных мініяцюр, які з'яўляецца адкрытым Рэспубліканскім № 21. Кожны жадаючы можа даслаць дзве свае новыя задумкі, якія міжнародны гросмайстар сам ацэніць і для пяці пераможцаў падрыхтаваў сюрпрыз — сваю кнігу «Гранды России» (Москва, Графпресс, 2008). Тры прызёры, акрамя таго, атрымаюць дыпломы ГА «Беларуская федэрацыя шашак». Так што запрашаем і ў гэтае спаборніцтва. Вашы творы чакаюцца да 01. 04. 2010 г. Іх трэба выслаць рэдакцыі альбо на электронны адрас суддзі-каардынатара, майстра ФМЖД Віктара Шульгі: shulga-@mail.ru.

**РАШЭННІ**

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

**«Пагода ў доме»-6/11** (М. Грушэўскі): ef6, gf6 (e5A) f8, a7x. A(g5) c1, a7x.

**Бліц-51/4** (М. Грушэўскі): 20, 8, 4 (34A) 10, 46x. A(13) 42!, 37/47x.

**«Госць з Узбекістана»** (І. Вальтэр): **№ 2** — c3 (e5A) d4, g3, g1#. A(f4) g5, d4, f2 (h4B) hg3#. B(f4) hg3, g1#.

**«Пагода ў доме»-6/12** (М. Грушэўскі): d6, g5! (f6A) d4, e3, c7 (d6) g7, c5 (e7) b6 (d6) a7 (e5, d4) f4, c1x. A(h6:d2A1) c7, b8 (hg3, e3) f4, d8x. A1(h2:d2) c7 (f4) b8x.

**Бліц-51/5** (П. Шклудаў): **№ 1** — 42, 31, 7, 8, 2, 40, 46x; **№ 2** — 42, 31, 7, 8, 2, 40, 30x; **№ 3** — 42, 31, 40, 30, 7, 8, 1, 30, 30x.

**Бліц-52/1** (П. Шклудаў): a7 (e5 ABCD) [ідэя В. Сокава] d2! (b6E) h8x. A(b8) c3 (e5) d2, c3, h8x. B(g3) d2, h4x. C(f6) c3 (g5) h6 (e5) d2, c3, d4x. D(h6) b8 (g5) h6, cd6, f4x. E(a1) c3, h8x.

Падрабязнасці

# Смеццеперапрацоўчы завод пабудуюць з улікам меркаванняў грамадскасці

**ПЫТАННЕ будаўніцтва ў Гродне прадпрыемства па перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў (дакладней, лініі па іх глыбокім сартаванні), як кажуць, на слыху ў абласным цэнтры ўжо не першы год. Можа нават скласціся ўражанне, што далей за планы і пажаданні справа не рухаецца. Аднак гэта не так, абвяргае песімістычныя настроі начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага гарвыканкама Мікалай Русакевіч. Ужо вызначыліся і з месцам размяшчэння прадпрыемства, і з тэхналагічным абсталяваннем.**

Пачынаючы з 2004 года, калі ранейшы палігон вычарпаў свае магчымасці па прыёме адходаў жыццядзейнасці горада, гэту задачу выконвае палігон у раёне вёскі Выселка Рагачы, што прыкладна ў сямнаццаці кіламетрах ад абласнога цэнтра. Ён быў разлічаны на 19 гадоў, аднак два з чатырох участкаў ужо практычна запоўненыя, і калі такія тэмпы захаваюцца і надалей, палігона хопіць не больш чым на пяць-шэсць гадоў. А далей што, зноў выдзяляць зямлю не пад аграрныя патрэбы ці будаўніцтва нейкіх аб'ектаў, а пад захаванне адходаў?

Зразумела, такі шлях тупіковы з пункту гледжання і рацыянальнага выкарыстання зямельных рэсурсаў, і экалогіі. Тым больш, што сусветнай практыкай ужо даўно даказана: адходы для руплівага гаспадара — гэта не толькі праблемы, выдаткі, але і выгада, прыбытак.

Паводле інфармацыі Мікалая Русакевіча, спецыяльна створанай распараджэннем старшыні аблвыканкама камісіяй разглядаліся тры тэхналагічныя варыянты «смеццевага» праекта. Найбольш аптымальнай для нашых рэалій палічылі лінію па глыбокім сартаванні цвёрдых камунальных адходаў, якую прапаноўвае адна з германскіх фірмаў. Прадпрыемства размесціцца на тэрыторыі палігона ў раёне вёскі Выселка Рагачы і разлічана на 120 тысяч тон бытавых адходаў у год з атрыманнем ад агульнага аб'ёму ад трыццаці да пяцідзесяці працэнтаў другасных рэсурсаў — пластыку, шкла, паперы, тэкстылю. Мяркуецца, што другасная сыравіна будзе прэсавацца ў пакеты і, згодна з заключанымі дагаворамі, пастаўляцца на перапрацоўчыя прадпрыемствы.

Гэта — першы этап. Пастаўшчыком абсталявання прадугледжаны і другі — атрыманне са смецця біягазу з наступнай выпрацоўкай электраэнергіі. Тут таксама не трэба адкрываць Амерыку, тэхналогіі вядомыя, аднак, паводле эканамічнага абгрунтавання, у цяперашніх умовах будаваць другую чаргу смеццеперапрацоўчага прадпрыемства нявыгадна. Але ў будучыні, не выключана, выдаткі стануць апраўданымі.

Кошт першай чаргі лініі па глыбокім сартаванні адходаў, разам з набыццём тэхнікі для прадпрыемства «Спецаўтагаспадарка» і вырабам кантэйнераў для смецця — 41 мільён долараў. Крэдыт на выгадных умовах дае Сусветны банк і канчатковае рашэнне на гэты конт чакаецца ў найбліжэйшы час. Прычым пазыка пачне вяртацца пасля завяршэння будаўніцтва завода — з бюджэтных сродкаў вобласці і краіны.

Сацыялагічнае даследаванне, якое праводзілася па ініцыятыве Сусветнага банка ў рамках гэтага праекта, засведчыла, што большасць людзей разумее важнасць скарачэння колькасці адходаў, што закопваюцца ў зямлю, і іх сартавання з наступным атрыманнем другасных рэсурсаў. У пераважнай часткі гараджан ёсць разуменне і таго, што ў сувязі з гэтым, магчыма, давядзецца больш плаціць за збор адходаў і ім самім. Наколькі шчырымі былі рэспандэнты? На думку арганізатараў апытання, не заўсёды, у прыватнасці, што датычыцца раздзельнага збору адходаў. На словах усе абедзвюма рукамі «за», але ў некаторых выпадках складвалася ўражанне, што чалавек гаворыць адно, а можа зрабіць іншае. І не паставіш жа вартаўнікоў, якія б кантралявалі, куды кідаць пластык, а куды — паперу.

Дарэчы, абавязковай умовай фінансавай падтрымкі гэтага праекта Сусветны банк вылучыў і яго грамадскае абмеркаванне, каб у людзей была дакладная інфармацыя аб усіх наступствах будаўніцтва прадпрыемства, у тым ліку і аб экалагічных аспектах. Добры прыклад для іншых важных праектаў у рамках мясцовага самакіравання. Праўда, адпаведнага вопыту ў нас няшмат і, мусіць, па гэтай прычыне грамадскае абмеркаванне будаўніцтва смеццеперапрацоўчага прадпрыемства прайшло не так актыўна, як можна было спадзявацца. Спачатку прыйшло вельмі мала людзей, а затым, калі аўдыторыя ў зале гарвыканкама сабралася значна большая, многія прадстаўнікі грамадскасці, як кажуць, адбывалі нумар. Той жа, хто быў сапраўды зацікаўлены ў гэтым абмеркаванні, звяртаўся да спецыялістаў з канкрэтнымі пытаннямі і атрымліваў ад іх такія ж канкрэтныя адказы.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПАВАЖАНЫЯ СУАЙЧЫННІКІ!

*У цяперашні час праводзяцца маштабныя работы па музеефікацыі помніка Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА — Нясвіжскага палацавага ансамбля, аднаго з найбольш значных музейных і турыстычных аб'ектаў нашай рэспублікі.*

*Сёння кожны жыхар рэспублікі, якому не абыякавы лёс нашай гісторыка-культурнай спадчыны, можа зрабіць свой уклад у высакародную справу па яе адраджэнні.*

*Дырэкцыя Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» звяртаецца з просьбай пасадзейнічаць у насычэнні музейных экспазіцый аўтэнтычнымі прадметамі мастацтва. Неабходны наступныя гісторыка-культурныя каштоўнасці: палацавая мэбля XVIII—п.тр. XX стст., прадметы выяўленчага мастацтва XVI—п тр. XX стст., прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (падсвечнікі, кандэлябры, вазы, збаны, гадзіннікі, дываны і г.д.) XVIII—п.тр. XX стст., прадметы ўзбраення XV—п.тр. XX стст. (узбраенне і воінскае абмундзіраванне, якое бытавала ў ВКЛ і РП у XV—XVIII стст., усходняя зброя, старадаўняя паляўнічая зброя), прадметы сакральнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XVI—XIX стст. (абразы, распяцце, арнаты, далматыкі і г.д.), прадметы побыту XIX—п тр. XX стст. (медны посуд, вагавымяральныя прыстасаванні, старадаўнія вінныя бочкі, кубкі, бутлі і г.д.).*

*Імёны і прозвішчы ўсіх дарыльшчыкаў будуць размешчаныя на асобным стэндзе ў адным з памяшканняў палаца. Магчымая закупка асобных прадметаў. Кантактныя тэлефоны: (01770) 5 41 45, 5 31 96.*

*Аплату гарантуем. Наш разліковы рахунак 3632900000007 у філіяле № 620 ААБ «Беларусбанк», код 523 у г. Нясвіжы.*

## ПАКУЛЬ КІРОЎЦЫ АДПАЧЫВАЛІ,

**невядомы зладзюжка «прысмактаўся» да паліўных бакаў іх аўтамабіляў і выкраў больш за тысячу літраў дызпаліва.**

Гэтае здарэнне, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, адбылося ў ноч на нядзелю на стаянцы, якая не ахоўвалася, на аўтадарозе Мінск — Брэст — мяжа РФ паблізу вёскі Стайкі Барысаўскага раёна. У распараджэнні спрытнюгі было крыху менш за сем гадзін, за якія ён паспеў «абслужыць» тры машыны: падабраўшы ключы да паліўных бакаў трох аўто (адзін з кіроўцаў — мінчанін, другі і трэці — расіяне), ён завалодаў адпаведна 400, 500 і 200 літрамі дызельнага паліва.

Пацярпелыя звярнуліся па дапамогу ў міліцыю, супрацоўнікі якой цяпер адшукваюць злачынцу.

**Ігар ГРЫШЫН.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# СЕЗОН СКОНЧЫЎСЯ? СЕЗОН РАСПАЧАЎСЯ!

**З 15 снежня, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у краіне «стартуе» чарговы — зімовы — сезон палявання на высакароднага аленя і дзіка.**

Доўжыцца ён будзе па 31 студзеня, паляваць дазваляецца ў светлы час сутак стрэльбавым спосабам з засады, з падыходу. Дазволена будзе здабываць дарослых самцоў трафейнай якасці высакароднага аленя і селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. Калі гаварыць пра дзіка, дык тут трафеямі паляўнічых могуць стаць жывёлы любога полу і ўзросту, акрамя свінаматак, што водзяць маладняк. Дагэтуль, нагадалі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі, падчас асенне-зімовага сезона палявання, акрамя вышэйазначаных спосабаў здабычы, дазвалялася паляваць на лася, высакароднага аленя, дзіка, еўрапейскую казулю яшчэ і загонным спосабам, а таксама з выкарыстаннем паляўнічых сабак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Бяспечныя забавы

# Запуск ракеты прайшоў нармальна?

**НЯЯКАСНАЯ, падробленая піратэхніка і не вытрымліванне правілаў бяспекі пры яе выкарыстанні можа прывесці да траўмаў, апёкаў і пажараў.**

Піратэхнічная прадукцыя мае 5 класаў небяспекі. У свабодным продажы знаходзяцца піратэхнічныя вырабы бытавога прызначэння 1-3 класаў небяспекі. Уся гэта прадукцыя сертыфікуецца, і яе выкарыстанне не патрабуе спецыяльных ведаў і навыкаў.

Паводле слоў **метадыста аддзела грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кацярыны АЛЯШКЕВІЧ**, абавязковае ўзгадненне з органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду патрабуецца падчас прымянення піратэхнічнай прадукцыі бытавога прызначэння ў культурна-асветных і відовішчных установах, пры правядзенні масавых мерапрыемстваў у памяшканнях, а таксама на дахах, балконах, любых частках фасадаў будынкаў.



Фота Пятра ФАМІНА.

Элементарныя меры засцярогі заключаюцца ў выкарыстанні піратэхнікі пры адсутнасці ветру на адлегласці не менш як 50 метраў ад будынкаў і ў 20 м ад людзей. Зразумела, што захоўваць такую прадукцыю неабходна ў сухім і цёмным месцы, недаступным для дзяцей.

Феерверкі ўмоўна дзеляцца на простыя і складаныя. Простыя можна выкарыстоўваць самастойна, калі ўважліва чытаць інструкцыю, вытрымліваць меры засцярогі і кіравацца здаровым сэнсам. Самыя распаўсюджаныя простыя піратэхнічныя сродкі — хлапушкі і бенгальскія агні. Хлапушкі не варта прымяняць паблізу, напрыклад, запаленых свечак, паколькі канфеці або серпанцін могуць загарэцца. Каляровыя бенгальскія агні вылучаюць падчас гарэння шкодныя вокісы, таму запальваць іх лепш толькі на адкрытым паветры, або адразу добра праветрываць памяшканне.

Складаныя феерверкі — ракеты, лятаючыя феерверкі — прафесійны від забаўляльнай піратэхнікі. Іх захоўванне і прымяненне звязана з высокай ступенню небяспекі і таму не спецыяліст можа браць удзел у такіх шоу толькі ў якасці гледача. Маленькім дзецям не рэкамендуецца прысутнічаць пры запуску такіх феерверкаў, паколькі моцныя гукі і яркія ўспышкі могуць напалохаць і аглушыць іх. Пасля разрыву ракеты на вышыні рэйка-стабілізатар (у некаторых відаў феерверкаў яна досыць цяжкая) падае на зямлю, таму запуск лепей праводзіць як мінімум у 100 м ад гледачоў.

Няшчасныя выпадкі, якія адбываюцца з-за піратэхнічных вырабаў, часцей за ўсё з'яўляюцца вынікам няправільнага і неасцярожнага выкарыстання, парушэння элементарных правілаў бяспекі або выкарыстання не па прызначэнні.

Наступныя рэкамендацыі дапамогуць арганізаваць самастойны феерверк без непрыемнасцяў:

1. Пляцоўка для феерверку павінна быць адкрытай, падалей ад любых аб'ектаў. Калі вы выбіраеце свой невялічкі двор, значыць, зможаце скарыстацца толькі пэўным асартыментам піратэхнікі: петардамі, хлапушкамі, вогненнымі ваўчкамі і коламі, але ні ў якім разе не запускаць ракеты. Лятаючыя вырабы могуць трапіць у акно, на дах і стаць прычынай пажару.
2. Гледачоў неабходна размясціць на адлегласці 15—20 метраў ад пускавой пляцоўкі.
3. Выбірайце вырабы, якія маюць сертыфікат і інструкцыю на зразумелай мове.
4. Не набывайце тыя, у якіх ёсць яўныя дэфекты і пашкоджанні.
5. Не вырабляйце феерверкі ў хатніх умовах.
6. Ракеты нельга запускаць з рукі, акна ці балкона. Запальваць феерверкі лепей падпаленай бенгальскай свечкай і абавязкова з адлегласці выцягнутай рукі.
7. Абкладзіце батарэі салютаў камянямі, зямлёй ці снегам, каб яны не ўпалі і не пачалі страляць у бок гледачоў. Майце пры сабе ёмістасць з вадой, каб патушыць нечаканыя крыніцы агню.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# МЕНЮ «КІНАВАРКІ», КАЛІ ЛАСКА!

**Адчуць смак кіно прапанаваў першы ў Беларусі форум малабюджэтнага альтэрнатыўнага відэа «КінаVarka»**

### Гатуюць усе!



Як расказвае **Уладзімір Максімкаў**, спачатку ён і яго каманда меркавалі, што заяўкі на ўдзел у конкурсе падасць максімум дзясятак гарадскіх «вар'ятаў», аднак ахвотных было прыкладна ў 10 разоў больш... І што цікава, сярод патэнцыйных удзельнікаў сустракаліся людзі з абсалютна розным узроўнем прафесійнай падрыхтоўкі: на суд гледача свае працы вырашылі вынесці і ўжо ў пэўным сэнсе вопытныя кліпмейкеры, і зоркі шоу-бізнэсу, і зусім невядомыя аматары кіно. З апошнімі ўзнікала нямала праблем, бо сцэнарыі многіх не былі пазбаўленыя сваёй разынкі, аднак падчас асабістай гутаркі высвятлялася, што некаторыя з ахвотных «прыгатаваць» сваё кіно ўвогуле не ўяўляюць сабе, як праходзіць працэс кіназдымак. «Але ўсё ж такі мы стараліся падтрымаць такіх людзей, і ў выніку яны апраўдвалі нашы надзеі, — не без гонару адзначае Максімкаў. — Аднак усе ўдзельнікі апынуліся ў аднолькавых ацэначных умовах, незалежна ад іх прафесійнай дасведчанасці, і скідак на свой невялікі вопыт не чакалі». Увогуле сіламі тэлекампаніі «Карамболь» было знята 7 фільмаў, да ўдзелу прымаліся таксама гатовыя работы. У выніку арганізатарамі мерапрыемства было адабрана 27 ролікаў, якія і прынялі ўдзел у выніковым он-лайн-галасаванні на сайце фестывалю. Па яго выніках быў уручаны прыз глядацкіх сімпатый.

Трэба сказаць, што інтэрнэт — гэта галоўная крыніца, у якой можна прагледзець конкурснае відэа. Праўда, ёсць яшчэ і сувенірныя дыскі, падораныя аўтарам і журналістам, што прысутнічалі на цырымоніі ўзнагароджання. Як адзначылі арганізатары, лёс гэтых дыскаў не мае камерцыйнага працягу, і наўрад ці мы пабачым знятыя фільмы, скажам, у эфіры беларускага тэлебачання. Хаця ў прынцыпе шмат якія з ролікаў прэтэндуюць на статус сацыяльнай рэкламы ці ўвогуле могуць служыць неблагой альтэрнатывай камерцыйнай рэкламе. Аднак цяпер адзінае, што можа даць фільмам другое дыханне, — гэта стварэнне своеасаблівага клуба эксперыментальнага кіно, у межах якога будуць праводзіцца паказы open-air — як мяркуецца, конкурснае відэа можна будзе ўбачыць на вялікім экране ва ўнутраным дворыку Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра IBB.

### Журы здымае пробу

Даўшы сваім марам волю, Максімкаў пахваліўся, што фестываль у нейкім сэнсе можна назваць міжнародным, бо, маўляў, адзін з фільмаў быў зняты ў Францыі з удзелам французскай актрысы, а рэжысёрам другога стаў мараканец па паходжанні Сімо Ламуісі. У прынцыпе, у Беларусі ўжо ёсць падобны фестываль студэнцкай аматарскай кінатворчасці «Кінагрань», які не адзін год мае статус міжнароднага, але не трэба засмучацца, што гэтая ніша ў нашай краіне ўжо занятая. Як адзначыў Іван Пінігін, у адной маленькай Галандыі праводзіцца каля 20 такіх фестываляў у год. Іх мэта — у вялізнай колькасці крэатыву знайсці сапраўдныя таленты, у якіх вар'яцтва праяўляецца на мяжы з геніяльнасцю. Увогуле ў Еўропе такія мерапрыемствы носяць назву аўдыёвізуальнага эксперыменту — яны становяцца пляцоўкай для творчых доследаў, падчас якіх удзельнікі вынаходзяць новыя фарматы, канцэпцыі, дызайнерскія кінапрыёмы. Гэта пашырае свядомасць і спрыяе ўзаемапранікненню розных відаў мастацтва... Ці ўдалося гэта? Як адзначыў у сваім відэазвароце старшыня журы — вядомы беларускі рэжысёр **Аляксандр Яфрэмаў**, — удалося, але далёка не ўсім... Аляксандр Васільевіч падзяліўся ўражаннямі наконт таго, што чакаў ад фестывалю лепшых вынікаў. Некаторыя работы яго расчаравалі, некаторыя парадавалі, а асобных аўтараў ён нават не супраць пабачыць у ліку сваіх студэнтаў.

Чаго ж не хапіла беларускаму творчаму эксперыменту для поўнага шчасця? **Іван Пінігін**, напрыклад, лічыць, што канкурсантам бракавала нейкага сапраўднага эпатажу, вар'яцкага максімалізму, які так характэрны для альтэрнатыўнага мастацтва. Маўляў, ёсць яшчэ ў працах нейкая скаванасць, цнота часоў панавання савецкай кінашколы. Але ў гэтым можна знайсці і станоўчыя моманты, бо ў Еўропе чамусьці альтэрнатыўнае кіно традыцыйна звязваюць з багаццем сцэнаў сэксуальнага характару і гвалту. Менавіта адсутнасць так званай «чарнухі» прыемна парадавала актрысу **Валерыю Арланаву**, якая адзначыла, што ў конкурсных работах побач з зусім кволым вар'яцтвам прысутнічаюць перш за ўсё здаровыя пачуцці, уласцівыя нармальнаму чалавеку, — каханне, пяшчота, дабрыня...

Тэлевядучая **Святлана Бароўская** расказвае, што першапачаткова даволі іранічна паставілася да просьбы стаць членам журы і траціць свой час на прагляд незразумелага аматарскага відэа. Але ў выніку яна адкрыла для сябе адзін такі цудоўны фільм, які, па яе словах, прыадчыніў у яе жыцці нейкую нябачную раней фортку. «Я прагледзела гэты фільм некалькі разоў і нават паказала амаль усім сябрам, хоць я ўжо дарослая дзяўчынка і разумею ў жыцці многія рэчы», — падзялілася ўражаннямі тэлевядучая, якая лічыць, што менавіта для такіх самародкаў варта праводзіць цэлыя фестывалі, нават калі большасць удзельнікаў будзе прысутнічаць на іх для масавасці. Трэба сказаць, што размова вялася пра фільм «Пяшчота», які здымаўся ў Францыі. Ён атрымаў перамогу ў намінацыі «Лепшая акцёрская работа», а да гран-пры яму не хапіла аднаго голаса...





Музычны фон «КінаВаркі».

Актрыса **Вера Палякова** лічыць, што яшчэ адзін плюс падобных кінафорумаў заключаецца ў тым, што яны даюць магчымасць самарэалізавацца незапатрабаваным акцёрам і рэжысёрам, якія, нягледзячы на строгі рэгламент у дзесяць хвілін, змаглі за такі кароткі час раскрыць душу перад гледачом. А акцёр **Алег Гарбуз** працягвае думку сваёй калегі, сцвярджаючы, што ўпершыню яму захацелася прымераць іншую творчую маску і паспрабаваць сябе не ў ролі акцёра, а ў ролі рэжысёра. Такія форумы — ідэальнае месца для творчага старту, і з гэтым пагадзіліся ўсе члены журы.

### Смакаванне...

У якасці прызоў для пераможцаў падрыхтавалі эксклюзіўны посуд з лагатыпам «КінаВарка»: для пераможцаў 10 намінацый — талеркі, а для ўладальніка гран-пры... каструлю!

Быў у сцэнарыі ўзнагароджання і яшчэ адзін цікавы бонус — спецыяльны прыз ад першай прыватнай кінашколы, якая нядаўна адчынілася ў Мінску. Яе дырэктар **Андрэй Палупанаў** выбраў свайго фаварыта конкурсу і літаральна падарыў яму бясплатнае «месца» на любую спецыяльнасць сваёй навучальнай установы. Гэтым шчаслівчыкам стаў **Аляксей Казлоўскі**, які вынес на суд журы дзве свае працы — «Імаха» і «Носьбіт».

Найбольш непаразуменняў выклікаў прысуд гран-пры, які быў уручаны **Максу Сіраму** за прафесійна зняты ім анімацыйны кліп «Ваўкі» на песню гурта «J:морс». Пераможца, як высветлілася, даведаўся аб сваім удзеле толькі за два дні да правядзення фіналу, «выпадкова зазірнуў» на ўзнагароджанне і гэтак жа «нечакана для сябе атрымаў галоўны прыз»...

Астатнія 9 намінацый былі больш-менш прадказальнымі. Адзінае, на што не звярнулі ўвагі арганізатары форуму, — праяўленне беларускай ментальнасці ў творах, дасціпнае адлюстраванне якой таксама заслугоўвае асобнай намінацыі. Форум усё ж такі наш, беларускі... Але гэта справа ўжо наступнага фестывалю, на якім, будзем спадзявацца, давядзецца адстойваць сваю самабытнасць у міжнародным асяродку.

**Яніна ГРЫЦКЕВІЧ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

OSCE KAZAKHSTAN 2010

# НАДЗЕЯ НА ЎСХОДНІ МЕНТАЛІТЭТ

**У Мінску абмеркавалі маючае адбыцца ў 2010 годзе старшынства Казахстана ў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ).**

З гэтай нагоды ў гатэлі «Еўропа» адбылася міжнародная канферэнцыя. У ёй удзельнічалі паслы краін АБСЕ і краін Еўрасаюза, дыпламаты, юрысты, аналітыкі, замежныя госці — спецыялісты ў гэтай тэме. У сваім прывітальным слове пасол Казахстана ў Мінску Анатоль Смірноў сказаў, у прыватнасці, што гэта пачэсная і адказная місія для яго дзяржавы, якая ўспрымае сваё выбранне на пасаду старшыні АБСЕ як аб'ектыўнае прызнанне, высокую і справядлівую ацэнку дасягненняў краіны ў розных сферах. І ў якасці старшыні АБСЕ Казахстан будзе працаваць для ўмацавання каштоўнасцяў і стандартаў гэтай аўтарытэтнай арганізацыі.

Многія выступоўцы падкрэслівалі, што Казахстан — калектыўны прадстаўнік СНД на пасадзе старшыні АБСЕ, а таму мусіць адстойваць на міжнароднай арэне інтарэсы, у прыватнасці, палітычныя і эканамічныя, удзельнікаў Садружнасці. Намеснік начальніка ўпраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва Міністэрства замежных спраў нашай краіны Аляксандр Опіямах таксама падкрэсліў, што Беларусь у свой час рашуча падтрымала Казахстан на вылучэнне. Дыпламат заўважыў, што ў нас цяпер з'явіўся выдатны шанц для вырашэння наспелых праблем у дзейнасці АБСЕ, актывізацыі барацьбы з рознымі праявамі арганізаванай злачыннасці, з распаўсюджваннем наркотыкаў, гандлем людзьмі і зброяй, нелегальнай міграцыяй, адмываннем «брудных» грошай. Аляксандр Опіямах таксама звярнуў увагу на неабходнасць спрашчэння візавых працэдур паміж краінамі — удзельніцамі АБСЕ. Гэта, мякка кажучы, няправільна, калі грамадзяне Беларусі плацяць 60 еўра за шэнгенскую візу.

Выканаўца абавязкаў кіраўніка офіса АБСЕ ў Мінску Жандос Асанаў адзначыў, што Казахстану як старшыні АБСЕ пераходзяць шмат якія складаныя пытанні, якія патрабуюць найхутчэйшага вырашэння, напрыклад, праблема энергетычнай бяспекі краін кантынента.

Загадчык кафедры міжнародных адносінаў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі Сяргей Кізім назваў з'яўленне Казахстана ў крэсле старшыні АБСЕ добрым сімвалам будучыні Еўропы, якая яму бачыцца як еўразійская. А таму, на яго погляд, Казахстан на чале АБСЕ выглядае вельмі пераканаўчым і лагічным кіраўніком.

Загадчык кафедры менеджменту Белдзяржуніверсітэта Барыс Паньшын засяродзіўся на перавагах Казахстана на пасадзе старшыні АБСЕ. А іх, на думку прафесара, дастаткова. Увогуле ён лічыць, што выбранне Казахстана — гэта заканамерны крок. У АБСЕ можа з поспехам быць выкарыстаны інтэграцыйны вопыт гэтай краіны ў СНД і Еўразіі, у стварэнні Мытнага саюза з Беларуссю і Расіяй, уменне Астаны весці палітычны дыялог з рознымі партнёрамі на платформе агульначалавечых каштоўнасцяў. Сёння, калі Еўропа сутыкаецца з сур'ёзнымі выклікамі, будзе вельмі дарэчы ўсходняя мудрасць, уласцівая казахам, яна дапаможа ім з гонарам выканаць пачэсную місію. Менавіта ўсходняя, ці, як выказаўся Барыс Паньшын, еўразійская ментальнасць, дазваляе спадзявацца на новыя тонкія падыходы ў разблытванні складаных вузлоў у адносінах асобных краін — удзельніц АБСЕ, на прадухіленне канфліктаў, унясенне элементаў талерантнасці, цярплівасці ў справы гэтай арганізацыі.

У час работы канферэнцыі прайшла прэзентацыя лагатыпа старшынства Казахстана ў АБСЕ, асноўнымі элементамі якога з'яўляюцца выява сонца — сімвал энергіі, і сілуэт беркута — сімвала незалежнасці, вышыні палёту, мэтанакіраванасці.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

### АДУМАЎСЯ

«Звязда» ўжо паведамляла, што ў Баранавічах на пешаходным пераходзе аўтамашынай была збіта жанчына з трохгадовым сынам. Вадзіцель з месца наезду з'ехаў, кінуў машыну і збег.

І вось праз тры дні ў гарадскі аддзел міліцыі прыйшоў 37-гадовы мужчына і заявіў, што ён той самы вадзіцель, якога шукае міліцыя. Мужчына прыйшоў не адзін, а з адвакатам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**КОРШУН Раісу Аляксандраўну** з вёскі Нягневічы Навагрудскага раёна сардэчна **віншуем з** прыгожым **юбілеем**. Жадаем здароўя, дабрабыту, поспехаў у працы.

*Няхай чакаюць цябе*
*толькі цёплыя словы,*
*Ад гора хай сэрца*
*твае не плача.*
*Хай заўсёды*
*кружыцца галава*
*Ад шчасця,*
*ад любві, ад*
*удачы.*

**Родныя.**

## У ГАРАЖЫ — МІЛЬЁН АДЗІНАК ПІРАТЭХНІКІ

**Багаты запас піратэхнічных вырабаў знойдзены і канфіскаваны з гаража мінчанкі супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Мінскага РУУС.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінаблвыканкама, піратэхніка знаходзілася ў гаражы 28-гадовай індывідуальнай прадпрымальніцы на вуліцы Алешава ў сталіцы. Варта адзначыць, што ніякіх дакументаў, якія пацвярджалі б законнасць набыцця і захоўвання «стралялак», жанчына не мела. Таму каля 1 мільёна адзінак піратэхнічных вырабаў на суму больш як 70 мільёнаў рублёў канфіскавана, а па факце праводзіцца цяпер праверка.

**Ігар ГРЫШЫН.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Лічу, прадмова непатрэбная. Яна аўтарская.

**Віктар КАЗЬКО.**

**Ад аўтара:**

*У гэтай нявыдуманай гісторыі ёсць дакладны адрас: вёска Бялюнцы, што на Гродзеншчыне. З яе «героямі» я пазнаёміўся, калі прыехаў у адпачынак да свайго цесця. Я сам бачыў непрыхаваную радасць ад таго, што ў іх крылатых суседзяў усё скончылася дабром ды мірам, падчас буслiных «урокаў» дзівіўся з ганка цесцевай хаты, як бацькі цярпліва ды настойліва вучылі падрослых, але баязлівых яшчэ буслянят лятаць, асцярожна спіхваючы іх з краю буслянкі ўніз, на зямлю.*

*З таго часу мінуўся не адзін год. Мала ўжо засталося ў вёсцы людзей — былых сведкаў той незвычайнай буслінай трывогі. Бліжэй да дзяцей, у сталіцу, перабраўся дзядзька Юзік, аднак пра даўнюю вясковую гісторыю не забыўся. Не-не ды ўзгадае: «Як яны там? Як там буслянка мая?»*

*І, мусіць, няма ў гэтым нічога дзіўнага: людзі ж — як птушкі, а птушкі — як людзі...*




Дзядзька Юзік прывык ужо, што кожную раніцу над падворкам чуўся вясёлы клёкат буслоў. Ён любіў гэтых белакрылых птахаў і заўсёды стараўся дапамагчы ім абжыцца на старой таполі. Не баючыся сарвацца ды патрушчыць старыя косці, пад умольнае бажканне жонкі, усцягваў туды вясною барану ці старое кола і ўсё чакаў, калі ж крылатыя госці прыляцяць, аблюбуюць гняздоўе. Каб яго заўважылі яшчэ здалёк, маглі вольна падлятаць ды садзіцца, дзядзька Юзік, абвязаўшыся вяроўкаю, каб, крый Божа, не сарвацца з вышыні, няўмольна абразаў сукі і расхабныя галіны. Але ж буслянка праз два-тры гады зноў зарастала, «хавалася» ў вецці, і дзядзька Юзік з прыкрасцю назіраў, што буслы, пакружыўшы над старым гняздоўем, не садзіліся, як раней, а некуды адляталі. Мабыць, у пошуках больш прыдатнага жытла. Зноў узбірацца на верхатуру таполі не было ўжо спрыту і сілы, і на ўсё лета двор, здавалася, сірацеў, застаўшыся без буслінай «музыкі».

Апошнім разам дзядзька Юзік усцягнуў кола на спілаваную вяршаліну прысадзістага ясеня, што рос каля самай адрыны. І як дзіця быў рады, што яго «зруб» спадабаўся буслам: яны ў першае ж лета давялі жытло да ладу, абжылі яго, а пад восень выбраліся ў далёкую дарогу, паставіўшы ў ім «на крыло» не двойню, а тройню цыбатых ды дзюбатых, як самі, дзетак.

На старым ясені буслы гнездаваліся ўжо не адно лета. Кожны дзень узляталі і вярталіся параю. Але аднае раніцы, выйшаўшы на ганак, дзядзька Юзік чамусьці не пачуў вясёлага пошчаку. Да таго ж убачыў: у гняздзе, апусціўшы дзюбу, стаіць толькі адна птушка. А дзе ж бусел? «Відаць, паляцеў на сенажаць снедаць», — падумалася дзядзьку Юзіку.

Звечарэла. Звычайна ў такі час буслы збіраюцца на начлег разам. А гэтая — зноў адна. Тое ж самае — раніцай наступнага дня. Устрывожыўся дзядзька Юзік, суседа клікнуў, які выганяў каровы з двара на пашу.

— Ты паглядзі-тка, Стась, ці не здарылася нешта. Бусел на начлег не з'явіўся. Такога ж быць не можа.

Сусед задраў галаву, зірнуў на буслянку.

— І праўда. На іх не падобна, каб недзе ды затрымаўся, да чужога гнязда прыстаў. Можа, які дурань падстрэліў ці сам дзе ў электраправады сунуўся і загінуў. Як у нас тут нядаўна...

Добрага тыдня сумавала бусліха адна. Мусіць жа, яна, бо на паляванне часцей гаспадар буслянкі лятае, а самка яйкі выседжвае. Шкада было яе дзядзьку Юзіку, ды нічога не зробіш, не дапаможаш. Гэта ж не кола ці барану ўсцягнуць на дрэва. «Што ж такое здарылася?» — не пераставаў турбавацца дзядзька Юзік. Дый сусед не заставаўся абыякавым, не-не ды цікавіўся: «Усё адна?»

Аднаго дня прылятае раптам да гняздоўя цэлая бусліная талака. Кружацца над буслянкай, падлятаюць да бусліхі, што стаіць на крайку гнязда, а не садзяцца. Бо толькі памкнуцца да гнязда — бусліха ў бой. Не падпускае ніводнага. Гэтак працягвалася тры дні. Потым буслы паляцелі. Застаўся толькі адзін. Ён сеў на галіну пад гняздом. Доўга сядзеў, задуменна водзячы дзюбаю, раз за разам падымаючы яе ўгару, дзе «трымала абарону» гаспадыня буслянкі. Нарэшце ўзмахнуў крыламі, узляцеў, зрабіў над буслянкаю два кругі і... апусціўся ў гняздо, стаў побач з ёю — з хвіліну таму такой ваяўнічай і непадступнай. Шчаслівы клёкат пачуўся над вёскай. Радаваліся птушкі, радаваўся дзядзька Юзік: «Бач ты, пакахаліся ўсё ж! А можа, даравала грэх?»

А гаспадыня буслянкі і новы гаспадар, клякочучы, мілаваліся: пяшчотна бралі дзюбу ў дзюбу, нібыта цалаваліся. Вяскоўцы дзівіліся: ці буслы адшукалі дзесьці ранейшага гаспадара-блудніка і прымусілі яго «пад канвоем» вярнуцца да роднай буслянкі, ці любы прымак знайшоўся? Хто ведае: не спытаеш жа ў іх...

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчыкі могуць выйграць электрафены, пыласосы, тэлевізары, печ ЗВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 студзеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **па 25 сакавіка 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 25 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 25.11.09.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 25.11.09 па 30.03.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1597 ад 23.11.09, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

4 **Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)
____________ на І кв. або 1–е паўг. 2010 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] ____________
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету** (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
Куды (прозвішча, ініцыялы)
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | лі-тар

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету** (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў |
|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | |

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
Куды (прозвішча, ініцыялы)
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Краіна здароўя
Выпуск № 52 (166)

## Флэш-моб са стужкамі

**Акцыю супраць гвалту і жорсткасці ў сям'і правёў на вуліцах Магілёва крызісны SOS-цэнтр для жанчын.**

Каб звярнуць увагу магілёўцаў на праблему, актывісты прышпільвалі людзям сімвалічныя фіялетавыя стужкі. Удзельнікі акцыі, у сваю чаргу, пакідалі рознакаляровыя стужкі на стэндзе з пажаданнямі адмовіцца ад гвалту ў сям'і.

— Мы хочам, каб людзі звярнулі ўвагу на праблему хатняга гвалту, — расказала **кіраўнік цэнтра Алёна ПУШКАРОВА**. — У наш цэнтр як мінімум двойчы на тыдзень звяртаюцца жанчыны, якія перажываюць псіхалагічны і фізічны ўціск у сваёй сям'і.

Трэба мяняць культуру зносінаў, выхоўваць сябе і сваіх дзяцей, каб жорсткасць у дачыненні да жанчын, дзяцей, старых не стала нормай сямейнага жыцця.

**Ілона ІВАНОВА.**

Дзіцячая тэма

# 5 МІФАЎ АБ РАХІЦЕ

**НЯГЛЕДЗЯЧЫ на значныя поспехі медыцыны, рахіт застаецца тым захворваннем, якое ў той ці іншай ступені закранае амаль кожнае другое або трэцяе дзіця на самым пачатковым этапе яго развіцця, а менавіта, на першым годзе жыцця. Рахіт, перанесены ў раннім узросце, можа прывесці да парушэння паставы, стойкіх дэфармацый груднной клеткі, ног, таза; садзейнічаць фарміраванню няправільнага прыкусу і плоскаступнёвасці; прыводзіць да затрымкі псіхаматорнага развіцця. Якія ж існуюць міфы аб гэтай хваробе і што трэба ведаць бацькам пра рахіт, каб засцерагчы ад яго сваё немаўля?**

**1 МІФ: РАХІТ — ХВАРОБА БЕДНЫХ СЛАЁЎ ГРАМАДСТВА.**

**Насамрэч:** рахіт — хвароба арганізма, які імкліва расце, гэта значыць дзяцей груднога і ранняга ўзросту (часцей ад 2 месяцаў да 1 года), і ён ёсць у 50—60 % малых. Калі немаўля хутка прыбаўляе ў вазе, яго касцям не хапае кальцыю, фосфару, вітаміну D, якія ён атрымлівае з ежай. Рахіт — стан часовы. Збалансаванае харчаванне, правільнае лячэнне — і праз некалькі месяцаў дзіця здаровае.

**2 МІФ: РАХІТ УЗНІКАЕ З-ЗА НЕДАХОПУ ВІТАМІНУ D.**

**Насамрэч:** рахіт і дэфіцыт вітаміну D — не сінонімы. Гэту хваробу выклікае не толькі недахоп вітаміну D, але і недахоп злучэнняў кальцыю і фосфару. Галоўная засцярога — правільныя суадносіны кальцыю і фосфару ў малацэ або штучнай сумесі, якія атрымлівае немаўля. Ідэальным для малога з'яўляецца груднoе малако, дзе кальцыю ў 2 разы больш, чым фосфару. А яшчэ ў грудным малацэ ёсць спецыяльныя бялкі, якія рэгулююць засваенне кальцыю. Таму немаўляты, якія растуць на маміным малацэ, радзей хварэюць на рахіт.

Другая важная ўмова — рух. Малы абавязкова павінен махаць ручкамі і перабіраць ножкамі, яму трэба рабіць масаж. Калі па якіх-небудзь прычынах ён абмежаваны ў руху, напрыклад, у яго зафіксаваныя ножкі з-за прыроджанага падвывіху сцягна, рызыка развіцця рахіту адразу ўзрастае. Вось у Афрыцы, здавалася б, столькі сонца! Значыць, у немаўлят выпрацоўваецца дастаткова вітаміну D, аднак дзяцей, якія хварэюць на рахіт, там таксама нямала. Прычына ў тым, што афрыканскія жанчыны традыцыйна сваіх дзяцей да 4 месяцаў спавіваюць «слупком». Дэфіцыт руху прыводзіць да захворвання, і нават вітамін D не выратоўвае.

І толькі на трэцім месяцы сярод умоў прафілактыкі стаіць гэты вітамін.

**3 МІФ: УСЕ НЕМАЎЛЯТЫ, ЯКІЯ РАСТУЦЬ НА ЗАМЕННІКАХ ГРУДНОГА МАЛАКА, ХВАРЭЮЦЬ НА РАХІТ.**

**Насамрэч:** не ўсе. Безумоўна, грудное малако абараняе малога лепш. Аднак у сучасных штучных сумесях ёсць прафілактычная доза вітаміну D. Акрамя таго, ёсць сумесі з «правільнымі» суадносінамі кальцыю і фосфару. З'явіліся сумесі з бэта-пальміцінавай кіслатой, якая дапамагае лепш засвоіць кальцый. Купляючы штучную сумесь, мама павінна прачытаць склад і ўспомніць формулу: «Кальцыю ў 2 разы больш, чым фосфару». Збалансаваны склад сумесі, масаж, працяглыя прагулкі на паветры, прафілактычныя дозы вітаміну D — усё гэта можа засцерагчы ад рахіту і «штучніка».

А маме, якая корміць грудзямі, варта паклапаціцца аб якасці свайго харчавання. Ёй неабходна з'ядаць не менш як 100 г тварагу на дзень, выпіваць 750 мл малака або кісламалочных прадуктаў, прымаць полівітаміны.

Пасля пераводу дзіцяці на дарослую ежу мама павінна памятаць, што вітамін D утрымліваецца ў тлустых гатунках рыбы, малочных тлушчах, яйках (жаўтках), сметанковым масле, алеі, арэхах, а таксама выпрацоўваецца пад уздзеяннем ультрафіялетавых прамянёў.

**4 МІФ: УСЕ ДЗЕЦІ ПАЎНОЧНЫХ КРАІН ХВАРЭЮЦЬ НА РАХІТ.**

**Насамрэч:** так, у рэгіёнах, дзе мала сонца, шмат пахмурных дзён або доўгая ноч, рызыка захварэць на рахіт у дзяцей павышаецца. Тэарэтычна, ва ўсіх дзяцей паўночных народаў павінен быць рахіт. Але прырода зрабіла мудра: паўночныя народы за тысячагоддзі адаптаваліся да палярнай ночы, і ў іх патрэба ў вітаміне D меншая, чым у паўднёвых. А вось дзеці выхадцаў з паўднёвых рэгіёнаў, якія нарадзіліся на поўначы, куды пераехалі іх бацькі, часта і цяжка хварэюць на рахіт.

Да рызыкі з'яўлення гэтага захворвання адносяць таксама:

- жыццё ў мегаполісе. Смог над горадам дрэнна прапускае прамяні Дорна — сонечныя прамяні пэўнай даўжыні, пад уплывам якіх у скуры выпрацоўваецца вітамін.
- нараджэнне восенню або зімой, калі мала сонечных дзён. Дзеці, якія з'явіліся на свет вясной або ў пачатку лета, радзей захворваюць на рахіт.
- вельмі юны або, насупраць, немалады ўзрост мамы. Пік накаплення касцявой масы ў жанчыны — 25 гадоў. У мамы, якая не дасягнула 17 гадоў, у самой яшчэ недастаткова кальцыю ў касцях, і яна не можа даць патрэбную колькасць малому. А мама пад сорак ужо пачала страчваць кальцый, ёй таксама няпроста забяспечыць ім дзіця.

**5 МІФ: ПЕРШАЯ ПРЫКМЕТА РАХІТУ — ВЫЦЕРТАЯ ПАТЫЛІЦА.**

**Насамрэч:** калі на патыліцы немаўляці выцерліся валасы — справа зайшла далёка. Першы сімптом, які з'яўляецца ў месяц-два, — у малога пацеюць галава і лоб падчас яды. Мама трымае галаву дзіцяці на сваёй руцэ, і падчас кармлення яе рука становіцца вільготнай.

Другі сімптом — пот дзіцяці становіцца «кіслым». Мама, цалуючы малога, адчувае гэта. Парушаецца кіслотна-шчолачны баланс у арганізме, узнікае патніца, пазбавіцца ад якой аднымі купаннямі цяжка.

Трэці сімптом — запоры, яны з'яўляюцца ў выніку агульнай гіпатаніі мышцаў, у тым ліку і мышцаў кішэчніка.

Чацвёртая прыкмета — чырвоны дэрмаграфізм: дакрануўся да дзіцяці — і на яго скуры застаецца чырвоны след, які праз хвіліну-другую знікае.

Калі ўсе гэтыя прыкметы ёсць у вашага малога, абавязкова скажыце пра гэта педыятру.

Пазней з'яўляецца палахлівасць, дзіця становіцца неспакойным, уздрыгвае ў адказ на гукі, увесь час круціць галавой, валаскі на патыліцы выціраюцца.

А калі ў немаўляці плоская патыліца, «жабін» жывот — гэта ўжо зусім запушчаны выпадак.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Інфарм-укол

## Піеланефрыт: лячэнне — не перарываць

**БАРАЦЬБА з такім захворваннем, як піеланефрыт — адной з найбольш частых прычын парушэння функцыі нырак — цяжкая і працяглая. Вядучае значэнне ў комплексным лячэнні піеланефрыту займае антыбактэрыяльная тэрапія антыбіётыкамі і хіміяпрэпаратамі. Адначасова дзіцяці прызначаюць вітаміны, адпаведную дыету і рэжым харчавання, вызначаюць рацыянальныя фізічныя нагрузкі.**

Паводле слоў загадчыцы клініка-дыягнастычнай лабараторыі 2-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Маргарыты МІРАНЕНКІ, піеланефрыт належыць да ліку інфекцыйных запаленчых захворванняў. Таму каб дабіцца выздараўлення, неабходна ліквідаваць мікроб, які выклікае запаленчы працэс. Як паказвае практыка, правядзення аднаго курса лячэння якім-небудзь адным прэпаратам бывае недастаткова. Неабходны шматразовыя, бесперапынныя курсы антыбіётыкаў і хіміяпрэпаратаў з паслядоўным іх чаргаваннем. Бацькі, якія кіруюцца неблагім знешнім станам дзіцяці і па парадзе «добрых» знаёмых перарываюць лячэнне, паводзяць сябе проста недапушчальна. Заўчасна, без дазволу ўрача, спыняць прыём прызначаных медыкаментаў небяспечна. Піеланефрыт можа абвастрыцца, і дабіцца паляпшэння тымі прэпаратамі, якія дапамагалі раней, будзе немагчыма.

**Прафілактыка піеланефрыту:**

— лячэнне хранічных ачагоў інфекцыі — карыесу, танзіліту, адэноідаў, запалення жоўцевага пузыра, ніжняга аддзела мачавой сістэмы (урэтрыту, цыстыту) і г.д.;

— пазбяганне кантактаў з інфекцыйнымі хворымі, асабліва падчас успышак грыпу і ВРВІ;

— забяспечванне рэгулярнага адтоку мачы (дзіця павінна мачыцца не радзей за адзін раз у 3-4 гадзіны).

## Сапсавалі грызуны гародніну

**АСНОЎНАЙ крыніцай такой вострай інфекцыйнай хваробы як іерсініёз для чалавека з'яўляюцца грызуны. Заражэнне адбываецца праз харчовыя прадукты, забруджаныя слядамі жыццядзейнасці тых жа мышэй і пацукоў.**

У ліку такіх прадуктаў могуць быць як гародніна, якую ўжылі ў сырым выглядзе, так і малако, пітная вада, мясныя прадукты і птушка, якія прайшлі недастатковую тэрмічную апрацоўку, тлумачыць валеолаг 2-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Антаніна ВАРАНЬКО.

Групавыя ўспышкі харчовых таксікаінфекцый узнікаюць, як правіла, у дзіцячых і іншых арганізаваных калектывах з цэнтралізаваным забеспячэннем харчовымі прадуктамі. Найбольш цяжка, з выражанымі з'явамі інтаксікацыі, хвароба працякае ў дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў. Захворванне праяўляецца інтаксікацыяй, павышэннем тэмпературы, галаўным болем, млоснасцю, бледнасцю скурных покрываў, далей з'яўляюцца ваніты і панос, паражэнне страўнікава-кішачнага тракта і іншых унутраных органаў, а таксама апорна-рухальнага апарату. Часам іерсініёзы могуць з'яўляцца прычынай апендыцыту. Захворванне можа назірацца на працягу ад некалькіх дзён да 4-12 месяцаў.

**Для папярэджвання масавай захваральнасці на іерсініёз рэкамендуецца:**

1. Вытрымліванне правілаў перавозкі і захоўвання гародніны. Абарона памяшканняў ад грызуноў, своечасовае іх вынішчэнне.
2. Дасканалы адбор, мыццё і ачыстка гародніны, садавіны і ягад, якія ўжываюцца без тэрмічнай апрацоўкі.
3. Вытрымліванне тэрмінаў захоўвання ачышчанай гародніны і гатовых страў.
4. Пры павышанай захваральнасці кішэчнымі інфекцыямі забараняецца ўжыванне ўсіх відаў гародніны і садавіны без тэрмічнай апрацоўкі.

## Запіць салодзенькае

**ПРЫСМАКІ служаць спецыфічным лёгкім харчовым раздражняльнікам, які нармалізуе тонус нервовай сістэмы дзяцей. Аднак такі станоўчы ўплыў салодкага на нервовую сістэму адзначаецца толькі тады, калі яго ўжываюць умерана — не больш 15-20 працэнтаў агульнай сутачнай колькасці вугляводаў у дзень.**

Мёд, варэнне, цукеркі і іншыя прысмакі, якія ўтрымліваюць 60 працэнтаў цукру, рэкамендуецца ўжываць з вадкасцю — чаем, малаком, вадой, колькасць якой павінна ў 10-12 разоў перавышаць колькасць салодкага. Калі пасля прыёму лёгказасваяльных вугляводаў поласць рота папаласкаць вадой, то ў роце застанецца вельмі нязначная колькасць цукру. Асабліва шкодны прыём вугляводаў у якасці апошняй стравы, калі гэта, напрыклад, пячэнне і ліпкія цукеркі, паколькі тут асабліва працягла захоўваюцца вугляводы ў поласці рота. Небяспечным у сэнсе ўтварэння карыесу з'яўляецца не само па сабе высокае ўтрыманне вугляводаў, а іх рэшткі пасля ўжывання ежы. Варта таксама памятаць, што для развіцця карыесу важнай з'яўляецца не абсалютная колькасць прынятых вугляводаў, а частата іх ужывання. Есці вугляводы рэкамендуецца толькі на сняданак і абед.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Жаночыя сакрэты

## АГЛЯД У ГІНЕКОЛАГА — 2 РАЗЫ НА ГОД!

**Медыкі вызначылі шэсць трывожных сігналаў і аб'ектыўных прычын не адкладваць візіт да жаночага доктара.**

**1. Сверб і смыленне, а таксама выдзяленні з палавых органаў.**

У норме выдзяленні з похвы празрыстыя, нямоцныя, не маюць паху і не выклікаюць раздражнення. Колькасць іх залежыць ад фазы менструальнага цыкла. Нехарактэрныя для пэўнай фазы менструальнага цыкла выдзяленні, сверб і смыленне могуць сігналізаваць аб такіх захворваннях, як малочніца (кандыдоз), хламідыёз, запаленне прыдаткаў маткі, яечнікаў і інш. Пры з'яўленні гэтых сімптомаў трэба абследавацца ў гінеколага на наяўнасць інфекцый.

**2. Парушэнні менструальнага цыкла.**

У норме менструальны цыкл доўжыцца ад 21 да 35 дзён, з іх 3—7 дзён — менструацыя. З'яўленне затрымак, незвычайна моцныя або працяглыя альбо, наадварот, кароткія менструацыі, млоснасць, галаўныя болі, страта прытомнасці сведчаць аб неабходнасці наведаць доктара. Паколькі рэпрадукцыйная сістэма жанчыны вельмі адчувальна рэагуе на стрэс, аслабленне імунітэту, рэзкае зніжэнне масы цела на фоне строгай неапраўданай дыеты, фізічныя нагрузкі, змяненні ў менструацыях могуць стаць першымі сімптомамі такіх захворванняў, як дысфункцыя яечнікаў, хранічны эндаметрыт і многія іншыя. Чым раней пачаць іх лячыць, тым прасцей будзе арганізму аднавіць здароўе.

**3. Падбор кантрацэпцыі.**

Спосаб кантрацэпцыі, які падыдзе менавіта вам, зможа падабраць толькі ўрач-гінеколаг. Ні рэклама, ні парады сяброўак не павінны ўплываць на выбар.

**4. Частая змена палавых партнёраў.**

Многія інфекцыі ў запушчаным стане могуць выклікаць сур'ёзныя захворванні, якія працякаюць без сімптомаў, напрыклад, вірус папіломы чалавека. У яго няма характэрных прыкметаў, і большасць людзей не ведаюць, што заражаныя або пераносяць яго. На працягу жыцця ім заражаюцца да 70 % маладых сэксуальна актыўных людзей, а гэта каля 13 % усяго насельніцтва свету. Таму не варта забывацца пра кантрацэпцыю і рэгулярнае наведванне гінеколага!

**5. Пытанні цяжарнасці.**

Адсутнасць цяжарнасці на працягу 12 месяцаў пасля пачатку рэгулярнага палавога жыцця без засцярогі павінна насцярожыць жанчыну і стаць прычынай для абследавання ў гінеколага на прадмет выяўлення паталогіі.

**6. Планавы агляд у гінеколага.**

Часцей за ўсё жанчыны звяртаюцца да доктара ўжо пасля з'яўлення хваравітых сімптомаў або парушэнняў.

Самымі цяжкімі наступствамі такой халатнасці ў дачыненні да свайго здароўя становяцца хранічныя запаленчыя працэсы рэпрадукцыйнай сістэмы, якія нярэдка вядуць да бясплоднасці, але самымі грознымі з'яўляюцца анкалагічныя захворванні. Таму пажадана праходзіць прафілактычны агляд не радзей як адзін раз у паўгода — тады вы зможаце прадухіліць магчымыя хваробы, а не спрабаваць вылечыць ужо наяўныя.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

## Нарасціць пазногці... І НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ ПРЫГАЖОСЦІ

Жаночыя сакрэты



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

**ДАЎЖЫНЯ пазногцяў не мае значэння. Галоўнае, каб яны былі чыстымі і дагледжанымі. Так кажуць. Але большасці жанчын усё адно падабаюцца пазногці даўжэзныя — як сімвал раскошы і прыгажосці. На жаль, прырода далёка не ўсім дае магчымасць адрасціць натуральныя цудоўныя пазногці. І на дапамогу прыйшлі тэхналогіі... Нарошчаныя пазногці — гэта хутка, прыгожа... але ці так бяспечна? Пра магчымыя ўскладненні і далікатныя моманты са штучным манікюрам — у пытаннях і адказах.**

**ЯКІЯ СУПРАЦЬПАКАЗАННІ ДЛЯ ПРАЦЭДУРЫ НАРОШЧВАННЯ ПАЗНОГЦЯЎ?**

Нарошчванне супрацьпаказана пры грыбковых захворваннях пазногцяў і магчымае толькі пасля поўнага вылечвання, а таксама пры наяўнасці механічных пашкоджанняў пазногцяў і кутыкулы (напрыклад, ранкі пасля манікюру), таму лепш устрымацца ад манікюру за 3—4 дні да нарошчвання.

Нарошчванне нельга рабіць тым, хто праходзіць курс хіміятэрапіі або прымае антыбіётыкі, а таксама дыябетыкам, алергікам і цяжарным жанчынам.

**ЯКІ МАТЭРЫЯЛ ЛЕПШ ВЫБРАЦЬ ДЛЯ НАРОШЧВАННЯ — ГЕЛЬ АБО АКРЫЛ?**

Кожны з іх мае свае плюсы і мінусы. Майстар глядзіць на стан роднага пазногця кліента і па ім вызначае, што лепш падыдзе.

**Акрыл** — дастаткова трывалы матэрыял, і пазногці з яго практычна не адрозніваюцца ад натуральных. Такія пазногці рэкамендуюць людзям, якія вядуць актыўны лад жыцця, валодаюць моцнымі, здаровымі пазногцямі ад прыроды.

**Мінусы:** акрыл мае рэзкі спецыфічны пах; для зняцця лаку з пазногця неабходна выкарыстоўваць вадкасці без утрымання ацэтону.

**Гелевы матэрыял для нарошчвання** — больш мяккі, таму яго лепш прымяняць жанчынам з гнуткімі і тонкімі пазногцямі.

**Мінусы:** ад гелевага «пратэза» не так проста пазбавіцца — яго давядзецца спілоўваць. Працэдура малапрыемная, ды і карысці пазногцям не прыносіць.

**ЯК ДОЎГА МОЖНА НАСІЦЬ ШТУЧНЫ МАНІКЮР?**

Існуе міф, што калі пазногці штучныя (тым больш, калі за іх заплачана нямала), значыць, з імі можна хадзіць пастаянна. Насамрэч лепш не злоўжываць нашэннем нарошчанага манікюру. Ідэальны варыянт — нарошчванне пазногцяў «з нагоды» (вяселле, юбілей і г.д.). Пасля ўрачыстасці можна дазволіць сабе пахадзіць з «прыгажосцю на руках» да трох тыдняў (да першай карэкцыі). Калі ж вы вырашылі працягнуць задавальненне, то лепш «насіць» пазногці не больш за 2—3 месяцы. А потым зняць, каб даць адпачынак роднай пазногцевай пласціне.

**ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ПАСЛЯ ПРАЦЭДУРЫ НАРОШЧВАННЯ НА ПАЛЬЦАХ З'ЯВІЛАСЯ ПАЧЫРВАНЕННЕ, СВЕРБ ЦІ ІНШЫЯ ЎСКЛАДНЕННІ?**

На працягу першых дзён пасля працэдуры адбываецца так званае прывыканне да іншароднага матэрыялу, якім з'яўляюцца нарошчаныя пазногці.

Цяжкасць алергічных праяў знаходзіцца ў прамой залежнасці ад індывідуальных асаблівасцяў арганізма чалавека. Як правіла, у большасці жанчын яны праходзяць праз 1—3 дні. Трэба толькі рабіць цёплыя рамонкавыя кампрэсы, змазваць скуру супрацьалергенным крэмам — і рукі прыйдуць у норму. Аднак у некаторых людзей алергія не знікае доўгі час, і адзінае выйсце тут — тэрміновы візіт да майстра і зняцце нарошчаных пазногцяў. Прыгажосць, вядома ж, патрабуе ахвяраў, але ўсё ж не такіх радыкальных.

Майце таксама на ўвазе: ускладненні часта ўзнікаюць з-за таго, што майстар няправільна правёў працэдуру нарошчвання. Выбірайце прафесіяналаў, а не аматараў.

**ЦІ МОЖНА САМАСТОЙНА ЗНЯЦЬ НАРОШЧАНЫЯ ПАЗНОГЦІ?**

Здымаць нарошчаныя пазногці пажадана ў майстра. А самастойнымі дзеяннямі вы можаце пашкодзіць пазногцевую пласціну або нанесці сабе сур'ёзную траўму.

**ШТО РАБІЦЬ, КАБ ШТУЧНЫ МАНІКЮР ЗАХОЎВАЎСЯ ІДЭАЛЬНЫМ ЯК МАГА ДАЎЖЭЙ?**

Па-першае, кожныя 2—3 тыдні неабходна праводзіць карэкцыю нарошчаных пазногцяў.

Па-другое, хоць штучныя пазногці і выглядаюць моцнымі і здаровымі, але і яны патрабуюць беражлівага стаўлення. Не выкарыстоўвайце нарошчаныя пазногці ў якасці прылады працы, не падвяргайце іх вялікім механічным нагрузкам, выконвайце хатнюю працу ў гумавых пальчатках. Памятайце, што пашкоджанне або адслойванне штучнага пазногця агаліць неабароненую, жывую пазногцевую пласціну. Яшчэ адна перасцярога — трымайцеся далей ад адкрытай крыніцы агню: вашы пазногці могуць расплавіцца.

Па-трэцяе, нарошчаныя пазногці нельга састрыгаць, іх можна толькі падпілоўваць неметалічнай дробназярністай пілкай.

Па-чацвёртае, перш чым нанесці лак, варта ўважліва агледзець нарошчаныя пазногці: ці не змяніўся іх колер, ці не з'явіліся плямы (гэта можа быць прыкметай заражэння грыбком або інфекцыі). У такім выпадку трэба як мага хутчэй паказаць пазногці майстру.

**ЯКІ ГАЛОЎНЫ НЕДАХОП НАРОШЧВАННЯ ПАЗНОГЦЯЎ?**

Пасля зняцця штучных пазногцяў родная пазногцевая пласціна выглядае слабай, амаль празрыстай і недагледжанай, асабліва ў асобаў, якіх прырода не надзяліла моцнымі пазногцямі. І потым патрэбна шмат часу, каб вярнуць прыстойны выгляд уласным пазногцям. А пастаянна хаваць іх пад нарошчанымі — гэта не выйсце.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Ёсць нагода!

# ЧЫМ БОЛЬШ ЧАЮ П'ЮЦЬ ЛЮДЗІ, ТЫМ МЕНШ СЯРОД ІХ ХВОРЫХ НА АНКАЛОГІЮ

**15 снежня — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ЧАЮ**



**Менавіта ў гэты дзень была абнародавана сусветная дэкларацыя правоў работнікаў чайнай індустрыі. Праўда, пакуль што гэтае свята шырока адзначаецца толькі ў Індыі і Шры-Ланцы. Не застанемся ж убаку.**

Першая згадка пра чай узыходзіць да глыбокай старажытнасці. Паводле адной з легендаў, імператар Паўднёвага Кітая Чэн НУНГ, які жыў у III тысячагоддзі да нашай эры, аднойчы пакаштаваў напой, які атрымаўся з лісця, што выпадкова трапіла ў кіпень. Напой быў настолькі духмяным і смачным, што імператар загадаў сабраць і захаваць гэтае цудоўнае лісце, і нават выдаў адпаведны загад аб прымяненні яго па ўсёй краіне. Напачатку чай выкарыстоўваўся як лекавая расліна, у першую чаргу як супрацьяддзе. Будыйскія манахі пілі чай падчас медытацый.

У 300-400 гадах нашай эры для прыгатавання напою сталі выкарыстоўваць у асноўным маладое лісце — «ча», адкуль і пайшла назва чаю.

Паступова чай распаўсюдзіўся ва ўсіх раёнах Кітая і стаў традыцыйным напоем. Па славутым «шоўкавым шляху» чай трапіў у Манголію і Тыбет. У Японіі чай з'явіўся ў 8 стагоддзі нашай эры. Крыху пазней — у Карэі, Інданэзіі, Шры-Ланцы, Індыі (індусы былі перакананы ў моцным уздзеянні чаю на арганізм і доўгі час лічылі яго наркотыкам). І толькі ў 1516 годзе, калі партугальцы адкрылі марскі шлях у Кітай, чай як экзатычны напой з'явіўся ў Еўропе (спачатку пры партугальскім каралеўскім двары). У Галандыі і Францыі чай пакаштавалі ў першай палове XVII стагоддзя. Прыкладна ў гэты ж час яго ацанілі і жыхары туманнага Альбіёна. У Расіі напой вядомы з 1638 года. Каля 60 кг сухога чайнага лісця ў якасці падарунку рускаму цару Міхаілу Фёдаравічу прывёз правіцель Манголіі, але сваю сапраўдную папулярнасць і народнае прызнанне гэты напой атрымаў у XIX стагоддзі, калі яго пачалі піць з самавараў у прыкуску з цукрам і самымі разнастайнымі ласункамі. На пачатку XVIII стагоддзя разам з каланістамі з Англіі напой з'явіўся ў Амерыцы. Менавіта прадпрымальныя амерыканцы прыдумалі чай у парцыённых пакеціках. Гандляр Томас Саліван, для таго, каб зэканоміць, замест металічных скрынак пачаў фасаваць сухую заварку ў маленькія мяшэчкі з шоўку. Кліенты Салівана не зразумелі, навошта чай так запакаваны, і пачалі заварваць яго проста ў гэтых мяшэчках. У нашы дні гэты спосаб самы папулярны ў свеце, нягледзячы на тое, што ў пакецікі фасуюць самыя танныя гатункі, труху.

Сёння чай — самы папулярны напой у свеце. У прамысловых маштабах яго вырошчваюць больш чым у 30 краінах свету.

Смак і водар напою залежаць ад таго, наколькі выспела лісце, у якую пару года быў сабраны ўраджай, дзе расце куст. Для вырабу элітных гатункаў чаю выкарыстоўваюць толькі бутон і два найбліжэйшыя да яго лісточкі. Ніжнія — з трэцяга па восьмы — падыходзяць для атрымання нізкіх гатункаў. Іншыя часткі расліны ў вытворчасці чаю не ўдзельнічаюць. Са 100 кг свежага лісця атрымліваецца каля 24 кг гатовага сухога прадукту. Толькі шляхам змены тэхналогіі вытворчасці з аднаго і таго ж лісця можна вырабіць 500 разнастайных гатункаў чаю.

Ужо навукова даказана, што чай не толькі смачны, але і вельмі карысны прадукт. Ён эфектыўны пры лячэнні і прафілактыцы шматлікіх сардэчнасасудзістых хваробаў. Абараняе ад карыесу (таніны, якія ён утрымлівае, перашкаджаюць утварэнню зубнога налёту і разбуральнаму ўздзеянню ежы на зубную эмаль). Чай паляпшае разумовую дзейнасць, памяць, здольнасць перапрацоўваць і засвойваць інфармацыю. Японскія вучоныя сцвярджаюць, што два кубачкі зялёнага чаю ў дзень дапамогуць сталым людзям захаваць памяць. Чай эфектыўны пры прафілактыцы анкалагічных захворванняў. Перапіс насельніцтва Японіі паказаў залежнасць узроўню захваральнасці ад аб'ёмаў ўжывання чаю. Чым больш чаю п'юць людзі, тым менш сярод іх хворых на анкалогію. Значна менш анкахворых сярод тых, хто выпівае больш за 10 кубачкаў чаю ў дзень. Кітайскія вучоныя перакананы, што чай станоўча ўздзейнічае на людзей з праблемамі скуры. Напой утрымлівае поліфенолы і таніны, якія памяншаюць раздражненне і запаленне. Такім хворым для дасягнення лячэбнага эфекту ўрачы раяць у дзень выпіваць не менш за 5 кубачкаў чаю. Чай карысны для захавання прыгажосці і маладосці. Зялёны чай перашкаджае ўтварэнню маршчын (бо ўтрымлівае антыаксіданты і чайны катэхін EGCG, які спрыяе рэактывацыі клетак). Каб доўга заставацца маладым і прыгожым, трэба выпіваць хоць бы адзін кубачак зялёнага чаю ў дзень. Акрамя таго, зялёны чай перашкаджае адкладанню тлушчаў.

Яшчэ старажытныя астролагі сцвярджалі, што дзейсным і рашучым натурам падыходзіць чай у гранулах, а людзям творчым і шматгранным — буйналіставы.

**Сучасныя астролагі паспрабавалі вызначыць, якія гатункі чаю лепш падыходзяць кожнаму знаку задыяка.**

**Казярогі,** пры ўсёй сваёй манументальнай заспакоенасці, даволі часта бываюць раздражнёнымі і неўраўнаважанымі. Для паляпшэння самаадчування і зняцця напружанасці Казярогам астролагі раяць зялёны чай з натуральнымі травамі і сушанымі ягадамі, так званыя фруктовыя сумесі.

Многія **Вадалеі** пакутуюць ад запаволенага кровазвароту, таму часта мёрзнуць. Ім найбольш падыдзе танізавальны напой, які паскорыць кровазварот, — зялёны чай з жэнь-шэнем, травяныя сумесі, а таксама чай пу-эр. Такія чаі выдатна танізуюць, сагравают, аднаўляюць сілы.

**Рыбы** таксама маюць патрэбу ў стымуляванні актыўнасці. Чай з танізавальным эфектам ім паказаны ранкам і вечарам. Астролагі раяць звярнуць увагу на матэ — прычым у розных варыянтах — матэ зялёны, матэ мятны, лімонны, сунічны.

**Авены** — натуры няўрымслівыя, часам эксцэнтрычныя, яны пастаянна рухаюцца да сваёй мэты і здольны трывала стаяць на нагах. Ім рэкамендуецца зялёны чай з дабаўкамі з трапічных фруктаў, а таксама чаі з мятай і мелісай.

Ніхто так не адданы сям'і і сябрам, як **Цяльцы**. Найбольш часта прадстаўнікі гэтага знака пакутуюць ад праблем з кішэчнікам. З гэтай прычыны найлепшы чай для іх — зялёны з лімонам, пажадана араматызаваны мятай ці бергамотам.

Для нармальнай жыццядзейнасці **Блізнят** неабходна пастаянная змена ўражанняў і абставінаў. Ім патрабуецца таксама і добры паўнавартасны сон. Для Блізнят астролагі прапануюць зялёны чай з фруктовымі і травянымі дабаўкамі, а таксама чаі з водарам ёгурта ці вяршкоў. І ўвогуле, чым больш разнастайнасці — тым лепш.

У адрозненне ад іншых знакаў задыяка, **Ракі** больш любяць піць чай пасля абеду — для заспакаення і нармалізацыі стрававання. Паколькі Ракі — «дзеці» Месяца, іх характар такі ж пераменлівы, як і яго святло. Найлепшы чай для Ракаў — зялёны з водарам кветак (лотасу, хрызантэмы, жасміну) і лясных ягад.

**Ільвы** маюць патрэбу ў чаях з агульным умацавальным эфектам (адзіным слабым месцам у Львоў з'яўляецца сэрца). Ільвам лепш выбіраць зялёны чай з водарам фруктаў і траў, якія ўплываюць на мышцу сэрца (барышніку, шыпшыны, чабрацу), якія здольны ўмацаваць імунітэт і ўзняць настрой.

**Дзевам** варта звярнуць увагу на свой кішэчнік. Ім лепш ужываць сумесі элітных зялёнага і чорнага чаю, а таксама чай ройбуш. Любімы чай Дзевы абавязкова павінен быць з фруктовымі водарамі (абрыкоса, нектарына), ванілі.

**Шалі** — сапраўдныя гурманы. Яны шукаюць гармонію і раўнавагу ва ўсім. Ім зоркі раяць зялёны чай з вытанчанымі экзатычнымі водарамі кветак, а таксама чай лапача і ройбуш.

Пры ўсіх сваіх якасцях **Скарпіёны** часта не ўважлівыя да свайго здароўя. Ім найбольш падыдзе вітамінны зялёны чай са спецыямі (карыцай, кардамонам, гваздзікай), чай з дабаўкамі ягад і садавіны, чай ройбуш і чырвоныя чаі з травянымі дабаўкамі (асмантусам, лотасам, жэнь-шэнем, каркадэ).

**Стральцы** заўсёды імкнуцца быць сярод людзей. Для іх вялікае значэнне мае чужое меркаванне аб іх персоне. Пры выбары чаю ім лепш аддаваць перавагу элітным гатункам. Астролагі раяць фруктовыя сумесі, папулярныя маркі зялёнага і белага чаю, травяныя сумесі з кавалачкамі экзатычных фруктаў.

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**



# 2010 — ЧАС ПАГОНІ ЗА МАРАЙ

**Як вядома, у кітайскім (усходнім) календары налічваецца 12 міфалагічных жывёл, кожная з якіх у свой час становіцца сімвалам года і надзяляе людзей уласцівымі ёй якасцямі. У заходняй (еўрапейскай) астралагічнай традыцыі за аснову прынята браць 12-гадовы цыкл абарачэння Юпітэра вакол Сонца, які штогод пераходзіць з аднаго знака задыяка ў іншы. Паводле кітайскага гараскопа, 2010 год будзе годам Тыгра. Ён амаль супадае з уваходжаннем Юпітэра ў знак Рыбаў.**

— Характарыстыкі года па ўсходнім і заходнім календарах часам супадаюць, часам — не, — тлумачыць **астролаг Кацярына ФЛІКОП**, — але, як правіла, абодва гараскопы дапаўняюць адзін аднаго.

**Тыгр** — жывёла высакародная, смелая, грацыёзная, ён рэвалюцыянер і аматар перамен. Рыбы — нестабільныя, паглыбленыя ў сябе, рамантыкі, летуценнікі. Тыгра і Рыбаў аб'ядноўвае адмаўленне стабільнасці, непрактычнасць, памкненне да перамен. Толькі ў Тыгра яно праяўляецца як цяга нешта зрабіць, нечага дасягнуць, адкрыць новае, нязведанае. Тыгр вылучаецца здаровым авантурызмам і прагне прыгодаў. Рыбы не такія актыўныя на знешнім плане, хаця перамены характэрныя і для іх. Проста праявяцца яны хутчэй у творчасці. Рыбаў і Тыгра аб'ядноўвае пагоня за марай, аднак метады яе дасягнення ў іх розныя.

У 2010 годзе як ніколі будуць запатрабаваныя ўласцівыя Рыбам якасці — міласэрнасць, суперажыванне, бескарыслівая дапамога іншым, самаахвяраванне — прычым не шырокай сацыяльнай скіраванасці, а з арыентацыяй на асобнага чалавека (Рыбы дзейнічаюць мякка і незаўважна, хаця іх уплыў можа быць вельмі значным).

Год Тыгра пачынаецца 14 лютага — у Дзень св. Валянціна. І гэта вельмі сімвалічна. Увогуле, Тыгр — жывёла сямейная. Ды яшчэ і аднапалюб. У Кітаі ён сімвал сям'і, нараджэння дзяцей. Можна меркаваць, што **ў 2010 годзе ў асабістых адносінах будзе панаваць шчырасць, гармонія, паразуменне.**

— Рыбы — рамантыкі, для якіх самае важнае — пачуцці, — працягвае астролаг. — Таму ў новым годзе многія з нас будуць жыць менавіта пачуццямі, рацыяналізм і асцярожнасць адыдуць на другі план. Пачуцці, эмоцыі будуць дамінаваць над розумам. Гэта будзе год прыгожых жэстаў дзеля заваявання каханага, год сардэчнасці, даверу, адчування адзінства з блізкімі, год рамантыкі, адкрытасці. Надыходзіць спрыяльны час для пошуку сваёй «палавінкі», фарміравання шчырых, сур'ёзных адносінаў, заснаваных на даверы, самаахвяраванні, на жаданні зрабіць каханага шчаслівым. Гэта будзе год КАХАННЯ, ЛЮБОВІ — у самым шырокім сэнсе (да блізкіх, сям'і, да свету ў цэлым).

Як мы ўжо казалі, Тыгр вылучаецца авантурызмам і прагай да перамен, таму, калі ў сям'і ў наступным годзе ўсё будзе выдатна, то на астатніх «франтах» чакаецца нестабільнасць. І ў першую чаргу гэта датычыцца фінансаў. Абвострыцца жаданне рызыкаваць грашыма, некуды іх укласці, на нешта выдаткаваць. І часта такая рызыка будзе неапраўданай, падкрэсліла астролаг. Таму лепш пазбягаць любых фінансавых авантур і праяўляць павышаную асцярожнасць. У год Тыгра фінансавая ўдача будзе спадарожнічаць высакародным натурам, якія ставяцца да грошай без піетэту. Калі чалавек сваімі добрымі бескарыслівымі ўчынкамі заслужыць добразычлівасць тандэма Тыгр/Рыбы, то грошы могуць прыйсці да яго самым нечаканым, неверагодным шляхам. А вось засяроджанасць на грошах і пагоня за прыбыткам эфекту не дасць. «Калі вы спакойна ставіцеся да матэрыяльных каштоўнасцяў і не ўзводзіце іх у культ, то яны ў наступным годзе будуць лёгка прыходзіць да вас, — адзначыла Кацярына ФЛІКОП. — Трэба памятаць, што год Тыгра і Юпітэра ў Рыбах — гэта час адрыву ад прыземленасці, матэрыяльнасці і звароту да адвечных духоўных каштоўнасцяў».

> **У год Тыгра фінансавая ўдача будзе спадарожнічаць высакародным натурам, якія ставяцца да грошай без піетэту. Калі чалавек сваімі добрымі бескарыслівымі ўчынкамі заслужыць добразычлівасць тандэма Тыгр/Рыбы, то грошы могуць прыйсці да яго самым нечаканым, неверагодным шляхам.**

## ШТО ДАРЫЦЬ?

Галоўнае патрабаванне да падарункаў — грунтоўнасць і знешняя прыгажосць. У адрозненне ад двух папярэдніх гадоў, калі мела значэнне практычнасць падарунка, а не яго ўпакоўка, цяпер давядзецца папацець і над афармленнем. Упакоўка — прыгожая, святочная, шыкоўная. Сам падарунак — вельмі якасны, пажадана — салідная фірмы. Карацей кажучы, у год Тыгра не варта эканоміць на падарунках.

Сувеніры можна дарыць толькі ў тым выпадку, калі гэта выява тыгра. Такую статуэтку лепш паставіць у заходнім кутку пакоя — тады тыгр будзе абараняць ваш дом ад негатыўных уздзеянняў. У якасці падарунка выдатна падыдуць любыя тэхнічныя навінкі (mp3-плэеры, мабільныя тэлефоны), а таксама рэчы, звязаныя з паездкамі, вандроўкамі (веласіпеды, аўтамабілі). Галоўнае, каб яны былі якаснымі і выдатна аформленымі.

## ЯК СУСТРАКАЦЬ ГОД ТЫГРА?

Мы гаворым пра традыцыйную святочную ноч з 31 снежня на 1 студзеня, але астролагі раяць паўтарыць сустрэчу і з 13 на 14 лютага, калі Тыгр уступіць у свае правы. Для асабліва апантаных святамі называём яшчэ адну дату — 18 студзеня. Менавіта ў гэты дзень Юпітэр «перасяляецца» ў сузор'е Рыбаў. Святкуйце на здароўе!

Характэрная для Тыгра якасці — вытанчанасць, грацыёзнасць, знешняя прыгажосць і жаданне паказаць сябе, таму астролагі раяць сур'ёзна падысці да ўпрыгожання дома. Усё павінна выглядаць эфектна, пышна, багата (задзейнічайце ўвесь арсенал — мішуру, сняжынкі, шарыкі, гірлянды, свечкі). Абавязкова выстаўце металічныя элементы дэкору — падсвечнікі, сталовае серабро.

Серабро ўвогуле самы важны метал года (2010 — год металічнага Тыгра), адпаведна — і сярэбраны колер. Вітаюцца таксама тыгрыныя колеры — аранжавы, жоўты, чорны, белы. Яны будуць актуальныя і ў адзенні, і ў інтэр'еры. З упрыгажэнняў лепш аддаць перавагу металам і натуральным камяням (асабліва бурштыну, «тыгроваму воку»). У адзенні варта зрабіць націск на эфектнасць, вытанчанасць і элегантнасць.

У год Тыгра на стале абавязкова павінна быць мяса і бабовыя — як крыніца бялку. Цудоўна, калі вы прыгатуеце шашлыкі, мяса на грылі. Ідэальны варыянт — выехаць з сям'ёй сустракаць Новы год на дачу, бліжэй да прыроды.

— Тыгр мае развітае пачуццё меры, — папярэджвае Кацярына Флікоп. — Таму, незалежна ад таго, дзе і з кім вы будзеце адзначаць навагоднее свята, пастарайцеся не злоўжываць ні алкаголем, ні стравамі, каб не ператварыцца ў ворага Тыгра — Малпу.

Увогуле, падкрэсліла Кацярына Флікоп, наступны год выдатна падыходзіць для таго, каб кожны змог знайсці сваё прызначэнне, свой сэнс жыцця, напоўніўся каханнем і аптымізмам, зрабіў нешта добрае для людзей і, безумоўна, смела крочыў за сваёй марай.

## СПРЫЯЛЬНЫЯ І НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ПЕРЫЯДЫ ГОДА

***З 15 студзеня па 20 сакавіка і з 1 верасня да канца года.*** Гэта час увасаблення мары, калі зоркі будуць дапамагаць нам рэалізаваць свае памкненні, ідэі на практыцы. Выдатны перыяд для новых знаёмстваў, развіцця рамантычных адносінаў («Брама Папялушкі»), час шанцавання і ўдачы.

***З 1 па 18 чэрвеня, з 8 па 30 верасня і з 26 снежня да канца года.*** Гэта спрыяльны час для любых перамен, пачатку новых праектаў, вандровак, час ажыццяўлення мары.

Яшчэ адзін працяглы светлы, станоўчы перыяд чакаецца ***з 17 красавіка да 14 ліпеня***. Гэта час удачы, добрых спраў, праяўлення сваіх найлепшых якасцяў, магчымасці быць сабой, пазбавіўшыся ад усяго дрэннага, турботнага, цяжкага. Час аптымізму і радасці жыцця.

Паводле сцвярджэння астролага, у цэлым наступны год абяцае стаць светлым, пазітыўным, хоць і «лыжак дзёгцю» таксама хопіць. Вельмі напружаных перыядаў будзе некалькі:

***З 10 студзеня па 15 лютага, з 13 па 29 жніўня*** — час сутыкнення сілаў, інтарэсаў, час канфліктаў і спакусаў, калі трэба праявіць асцярожнасць, не ўступаць у канфлікты, не паглыбляцца ва ўнутраных перажываннях, у дэпрэсію, агрэсію і раздражненне. Ніякіх перамен у гэты час прадпрымаць не рэкамендуецца. Асабліва ***13—23 жніўня*** нельга рабіць «рэзкіх рухаў», гэты час проста трэба перачакаць.

***З 7 па 24 чэрвеня*** павялічыцца рызыка паддацца сумным думкам, адчуванню непатрэбнасці і адзіноты. У гэтыя дні трэба больш бываць сярод людзей, весела бавіць час, знайсці тое, што прыносіць вам радасць.

***З 20 ліпеня па 5 жніўня*** трэба вельмі пастарацца, каб не паддацца спакусам і правакацыям, жаданню адпомсціць тым, хто вас пакрыўдзіў. У гэты час нельга мяняць сваё жыццё, прымаць вельмі важныя рашэнні, асабліва на эмоцыях. Трымайцеся — пройдзе час і ўсё будзе выглядаць не такім змрочным, як тады падавалася.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

---

Муз-news

## N.R.M. ЗЛАДЗІЦЬ АКУСТЫЧНАЕ 15-ГОДДЗЕ

**Гурт, які без перабольшання лічыцца легендай айчыннай рок-музыкі, сёлета ў Мінску не выступаў, і першы канцэрт адбудзецца толькі напрыканцы года — 17 снежня. Але затое з якой нагоды! Адмысловай праграмай, якая замешана з хітоў, матэрыялаў супольных праектаў, калядных песень і некалькіх сюрпрызаў, музыкі адсвяткуюць 15-годдзе калектыву.**




Нягледзячы на афіцыйную рэабілітацыю, якая не так даўно адбылася з колішнімі «забароненымі» гуртамі, удзельнікі N.R.M. сёлета ўзялі творчыя канікулы. Кожны займаўся асабістымі справамі, а разам збіраліся некалькі разоў, каб выступіць на замежных фестывалях. Таму калядны імянінны канцэрт — выдатная нагода для прыхільнікаў пабачыць зноў разам усю каманду — Лявона Вольскага, Піта Паўлава, Юрася Ляўкова і Алезіса Дземідовіча. Тым больш, што сустрэча гэта намечана неафіцыйнай і акустычнай. «Асабіста мне акустычныя канцэрты падабаюцца больш цёплымі адносінамі з гледачамі, хатняй атмасферай і магчымасцю суцэльнай імправізацыі, — сцвярджае Лявон Вольскі. — Мы граем песні, нешта распавядаем, жартуем, адказваем на пытанні і зноў граем — часам выконваем нават нейкія абсурдныя творы, якія за межамі акустыкі ўвогуле не існуюць». Дарэчы, уладальнікі першых 100 квіткоў, замоўленых праз сайт www.soundline.by, атрымаюць у дадатак да жывога выступлення падарунак — рарытэтны кампакт-дыск.

## ЛЕСЯ КОДУШ І СЛАВА НАГОРНЫ СУДЗЯЦЦА ЗА «ФІШКУ»

**Сямейны дуэт з Лесі Кодуш і Славы Нагорнага знаёмы слухачам найперш па хіце «І ўсё такое». Але, як высветлілася, папулярнасць гэтая песня, напісаная Алегам Елісеенкавым і Святланай Салагуб, прынесла не толькі беларускім артыстам. Ва Украіне кампазіцыю паспяхова пераспявалі выканаўцы Ганна Сінгаеўская і Любамір Чармак, і нават знялі кліп!**



Паводле слоў Славы Нагорнага, з украінскімі артыстамі яны пазнаёміліся падчас канцэрта ў горадзе Паўднёваўкраінску. Песню пра «такую фішку» настолькі ўпадабаў прадзюсар украінскага калектыву, што прапанаваў аўтарам яе выкупіць — але атрымаў адмову. «Потым мы атрымалі прапанову запісаць гэту песню разам, — узгадвае Слава. — Палічылі, што тандэм беларускага і ўкраінскага дуэта — гэта цікавы эксперымент, і пагадзіліся. Прыдумалі канцэпцыю сумеснага кліпа. Але праз нейкі час украінцы адмовіліся ад праекта. Уяўляеце, як мы здзівіліся, калі знаёмы гукарэжысёр паведаміў, што чуў на ўкраінскіх каналах нашу песню ў выкананні іншых людзей!». У той жа дзень гэты запіс быў знойдзены ў інтэрнэце — без аніякіх змяненняў у тэксце, мелодыі і аранжыроўцы, але... з іншым аўтарам. Украінскі дуэт, аднак, факт крадзяжу адмаўляе, а беларускім выканаўцам і аўтарам давялося звярнуцца ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, каб давесці справу да суда.

## У КАЎНАСЕ ЗАСЛУХАЛІСЯ «ВЯРБОЙ»

**Удзельніца дзіцячага «Еўрабачання-2008», 13-гадовая мінчанка Даша Надзіна стала ўладальніцай другой прэміі на IX Міжнародным конкурсе юных талентаў «Kaunas-talent 2009».**



Гэты конкурс, які адбываўся ў Літве цягам 5 дзён, сабраў больш як 100 вакалістаў ва ўзросце ад 7 да 25 гадоў з 12 краін свету. Беларусь прадставіла якраз Даша Надзіна — вучаніца мастацкага кіраўніка Нацыянальнага цэнтра музычных мастацтваў імя У. Мулявіна Святланы Стацэнкі. У трох турах спаборніцтва юная спявачка выканала беларускамоўную песню «Вярба», кампазіцыі «Давайце сябраваць» і «Не паўтарэецца такое ніколі». У выніку міжнароднае журы з 11 чалавек прысудзіла дзяўчыне другую прэмію. Таксама песня «Вярба» трапіла ў CD-зборнік лепшых песень конкурсу.

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

---

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.22 | 15.47 | 7.25 |
| Віцебск — | 8.19 | 15.29 | 7.10 |
| Магілёў — | 8.12 | 15.37 | 7.25 |
| Гомель — | 8.00 | 15.42 | 7.42 |
| Гродна — | 8.36 | 16.04 | 7.28 |
| Брэст — | 8.28 | 16.13 | 7.45 |

**Месяц**
*Маладзік 16 снежня. Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**
*Пр. Андрэя, Антона, Канстанціна, Мацвея.*
*К. Марыі, Ніны, Валяр'яна, Віктара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## Дзве даты — 15 снежня

**1922 год** — пачаў работу IV Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, на якім было прынята рашэнне аб уваходжанні Беларускай ССР на аднолькавых правах з РСФСР, УССР і Закаўказкай Федэрацыяй у Саюз ССР.



**37 год** — нарадзіўся Нерон, рымскі імператар. Праславіўся тым, што ў 64 годзе загадаў падпаліць Рым, большая частка горада згарэла. Каб адвесці ад сябе падазрэнні і супакоіць народ, абвінаваціў у гэтым хрысціян, пачаўшы жорсткія іх праследаванні. Рэпрэсіямі настроіў супраць сябе розныя слаі рымскага грамадства. Баючыся паўстання і расправы, збег з Рыма.

## Цытата дня:

***«Не ўвесь жа час весці гутарку аб тым, якім павінен быць чалавек, час і стаць ім!».***
**Марк Аўрэлій (121—180), рымскі імператар.**

# ДЗЕ ПЕРААПРАНАЛІ НЯВЕСТУ?

Свет і сусвет чалавека

**У культуры ўсходніх славянаў існавала традыцыя апранаць нявесту ў вясельныя строі не ў бацькоўскай хаце. Гэта забарона была звязана з разуменнем сімволікі самой хаты. Яна ўспрымалася як тая адухоўлена-ажыўленая прастора, у якой сям'я пачувала сябе абароненай ад уздзеяння негатыўных сілаў.**

- На час свайго статусна-рытуальнага пераўвасаблення нявеста павінна была пайсці з хаты. Прычын таму было некалькі. Па-першае, уся прастора сялянскай традыцыйнай хаты была запоўнена самай блізкай радзінай, якая завіхалася вакол печы і святочнага стала. Па-другое (і гэта самае галоўнае), усе ключавыя рытуалы пераходнага тыпу распачыналіся пэўным адхіленнем галоўнага персанажа, яго абавязковым вылучэннем з кола ўсёй радзіны і сімвалічным пераняcеннем у прастору іншасвету.
- Даволі строгія патрабаванні існавалі да выбару хаты, у якой учарашняя сяброўка ператваралася ў цудоўную прыгажуню. Перш за ўсё, нявесту нельга было пераводзіць цераз вуліцу, таму выбар прыпадаў на тую хату, якая знаходзілася на баку бацькоўскага дома. Катэгарычна забаранялася апранаць нявесту ў хаце ўдавы, разведзенай сямейнай пары, бяздзетных людзей, у доме, дзе на працягу апошняга года хтосьці памёр ці ў той хаце, дзе паміралі дзеці або калісьці быў пажар. Лічылася, што гэты рытуал лепш за ўсё праводзіць у той хаце, дзе жыла шчаслівая, дружная, багатая на дзяцей і заможная сям'я.
- У некаторых рэгіёнах прытрымліваліся правіла апранаць нявесту ў дальнім пакоі бацькоўскай хаты — «у каморы».
- Аўра шчырасці і бязмежнай дабрыні вітала вакол усіх, хто знаходзіўся побач з нявестай, ператвараючы яе са звычайнай вясковай дзяўчыны ў цудоўную Жар-Птушку. Адкрытасць і сардэчная пранікнёнасць зыходзілі ад удзельнікаў урачыстасці. РОД аберагаў чарговы «парастак» на сваёй велічнай кроне ад любой магчымасці негатыўнага ўздзеяння.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

---

Прыгожае жыццё

# «Міс свету-2009» родам з Гібралтара



Інтрыга з выбарамі першай прыгажуні свету вырашылася ў мінулую суботу ў Горадзе Золата — Ёханэсбургу, дзе адбыўся фінал конкурсу «Міс свету-2009». Тытул пераможцы і ўсыпаная дыяментамі карона ад ювелірнага дома Garrard перайшлі з рук леташняй каралевы, расіянкі Ксеніі Сухінавай, новай яе вялікасці — 23-гадовай Каянэ Алдарына з Гібралтара. Даўганогую брунетку называлі ў ліку фаварытак конкурсу яшчэ задоўга да фіналу — асаблівую ўвагу прыгажуня прыцягнула да сябе пасля перамогі ў папярэднім міні-конкурсе «Міс пляж». На радзіме дзяўчына, дарэчы, працуе спецыялістам у аддзеле кадраў буйной кампаніі. Але ў найбліжэйшы год на працоўным месцы Каянэ наўрад ці з'явіцца: па традыцыі, «Міс свету» павінна год пражыць у Лондане і ўдзельнічаць у шматлікіх акцыях, зладжаных Міжнароднай арганізацыяй прыгажосці — толькі пасля гэтага дзяўчына атрымае грашовы прыз у 85 тысяч долараў ЗША.

Першай віцэ-міс журы назвала прадстаўніцу Мексікі Перлу Бельтран, другой — канкурсантку з краіны-гаспадыні сёлетняга конкурсу Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Татум Кешвар. Усяго ж за званне самай прыгожай дзяўчыны ў свеце спаборнічалі ўдзельніцы са 112 краін свету, у тым ліку і Беларусі. Нашу краіну прадстаўляла Юлія Сіндзеева, якая хоць і трапіла ў модны дагэтуль трэнд брунетак, але ў лік прызёрак не ўвайшла.

**Ліна МАЛІНІНА.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




---

Песня — гэта свята

Бяседныя песні

# КАЛІ КАЛІНА НЕ ЦВІЛА

«Юрачка! Сапраўдны Юрачка», — усклікнуў Генадзь Цітовіч, калі ўпершыню ўбачыў прыветна ўсмешлівага дваццацідвухгадовага юнака з прамяніста блакітнымі вачыма і светла-залацістымі пасмамі валасоў. Узрушаны маэстра адразу ж прапанаваў яму працу ў балетнай групе. Так у 1970 годзе Анатоль Кашталапаў стаў артыстам Дзяржаўнага народнага хору Беларусі. Але станцаваць «Юрачку» не давялося. У гэты перыяд стварыўся фальклорна-харэаграфічны ансамбль «Харошкі», і таленавіты танцоўшчык перайшоў у новы калектыў, дзе былі большыя магчымасці для творчага выяўлення. Тут ён атрымаў і ганаровае званне «Заслужаны артыст Беларусі».



Землякі-творцы. На першым плане — Васіль КУПРЫЯНЕНКА і Анатоль КАШТАЛАПАЎ. 1994 г.

Разнастайна разгарнуўся талент Анатоля Кашталапава ў ансамблі народнай музыкі «Свята», у які ён прыйшоў ужо саракагадовым удумлівым і спрактыкаваным артыстам па запрашэнні мастацкага кіраўніка Васіля Купрыяненкі. Іх звязвала і сумесная праца ў «Харошках», і зямляцкія стасункі (Анатоль Міхайлавіч таксама нарадзіўся ў Магілёве, але на два гады раней 20 ліпеня 1948 года), і вялікае жаданне зберагчы духоўную спадчыну роднай зямлі, і здольнасць да творчага пераўвасаблення. Маляўніча, тэмпераментна і разнапланава выступае артыст у танцах, у жанравых сцэнках з гармонікам, баянам, дудачкай. І тады песні «Калі каліна не цвіла», «Пасею гурочкі», «Песня-балада» набываюць востра драматычнае гучанне, у іх узмацняецца напружанасць пры перадачы пачуццяў, адчуваецца непарыўная сувязь з часам... А з 2001 года Анатоль Кашталапаў — нястомны арганізатар калектыву, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята». Песня запісана на радзіме Івана Мележа.

*Калі каліна не цвіла,*
*То не ламай каліну.*
*Калі ты ў арміі не быў,*
*То не кахай дзяўчыну.*

Прыпеў:
*Я памятаю той жа час —*
*Ты плакала за мною,*
*На развітанне раз у раз*
*Махала хусцiною.*

*Не трэба было разбіваць*
*Грачнёвыя паловы.*
*Не трэба было задаваць*
*Гарачае любові.*
Прыпеў.

*Калі каліна адцвіла,*
*Тады ламай каліну.*
*Калі ты армію адбыў,*
*Тады кахай дзяўчыну.*
Прыпеў.

Апошнія два радкі прыпеву паўтараюцца.

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**




---

## Усміхнемся!

**— Кожны раз, калі ўстаю ноччу з ложка, наступаю на адны і тыя ж граблі...**
**— ?**
**— На ката...**

☺

Іду па вуліцы — надвор'е цудоўнае, настрой выдатны. Божухна, зрабі так, каб ва ўсіх навокал быў такі ж цудоўны настрой!

Паслізнуўся, упаў у лужыну. Усе навокал радуюцца, смяюцца, сволачы!

☺

**— Я тут сабе лямпачку энергазберагальную купіў, прыйшоў дадому, укруціў, а яна не гарыць.**
**— Усё правільна, беражэ энергію...**

☺

Хай брытанскія навукоўцы хоць раз зробяць нешта карыснае і даследуюць наступнае пытанне:
«Куды ў гадзіну пік едуць усе гэтыя бабулі?!»

☺

**Двое сяброў.**
**— Ты п'яны ці што?**
**— Не.**
**— А чаму ты раздвойваешся?!**




---

Жукоўская Ганна Трафімаўна нарадзілася 15 снежня 1919 г. у вёсцы Славені Талачынскага раёна ў сям'і сялян. У 1939—1941 гадах працавала настаўніцай у Старых Дарогах. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічала ў партызанскім руху на Віцебшчыне. 1944—1945 гады — дырэктар школы ў в. Славені. Потым працавала настаўніцай у Ганцавічах, а з 1954 г. у в. Малькавічы Ганцавіцкага раёна. Педагагічны стаж — 46 гадоў.

Віншуем любую матулю **Ганну Трафімаўну ЖУКОЎСКУЮ з 90-годдзем** з дня нараджэння. Жадаем заўжды бадзёрага настрою і добрага здароўя.

*А сябе мы надзеяй цешым,*
*Што ў сузор'і жаданых гасцей*
*Мы адзначым з табою, матуля,*
*100-гадовы твой юбілей.*

**Сыны Віктар, Анатоль і Генадзь ЕРАФЕЕНКІ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 6849. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12